ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 80 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -ваднку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

СЕРАДА, 28 мая 1930 г.
№ 123 (3721)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Узмацніць тэмп сяўбы

Тэлеграф прыносіць нам весткі аб пасьпяховым сканчэньні сяўбы ў радзе калгасаў. Многія з іх даюць яскравыя прыклады барацьбы за пашырэньне плошчы. Вопыт працы гэтых калгасаў яшчэ раз, як нельга лепш, паказвае, што заданьне ўраду аб павялічэньні яравога кліну па 12 проц. зусім рэальна, можа і павінна быць выканана. Усе залежыць не ад аб'ектыўных прычын, а ад нашай энэргіі і ініцыятывы, арганізацыі працы ў калгасах, уменьня наладзіць правільныя ўзаемаадносіны паміж калгаснікамі і індывідуальнымі гаспадаркамі.

На фоне гэтых паасобных дасягненьняў і посьпехаў зьяўляецца асабліва недапушчальным той агульны слабы тэмп сяўбы, сьведкамі якога мы зьяўляемся, на жаль, да гэтага часу.

Па зводцы **на 20 мая**, пасеўны плян у БССР выкананы толькі на 50,9 проц. Між тым, сяўба ва ўсіх акругах разгарнулася месяц таму назад. Паўднёвыя акругі прыступілі да палявых работ значна раней. Вынікі такіх яшчэ недастатковыя. Калі і ў далейшым работа будзе ісьці такім-жа тэмпам, дык сяўба можа зацягнуцца.

Аналіз пасеўных зводак па пяцідзёўках пацьвярджае гэтую ацэнку. На 10 мая было засеяна 29,3 проц. пляну, на 15 мая — 40,8 проц. і на 20 мая — 50,9 проц. Такім чынам, за пяцідзёўку засяваецца толькі 10 проц. пляну. Пры такіх стабільных тэмпах сяўбы выходзіць, што для 100 процантнага выкананьня пляну патрабуецца яшчэ мінімум 20-25 дзён. Тэрмін вельмі вялікі і ні ў якім разе ня можа нас задаволіць.

Паўднёвыя акругі павінны былі-б ужо канчаць пасеўную кампанію. Між тым, самая паўднёвая акруга — Мазырская выканала на 20 мая толькі 64 проц. заданьня.

Асабліва вялікую небясьпеку выклікае слабы ход сяўбы тэхнічных культур: выканана толькі — 28,6 проц. пляну. Важнейшыя ільнаводныя акругі даюць зусім мізэрныя лічбы — Полацак — 5,1 проц. і Віцебск — 9,2 проц. Калгасы ўсё яшчэ адстаюць па тэхнічных культурах ад індывідуальнага сэктару.

Небясьпечна і з сяўбой бульбы, вельмі важнай для БССР культуры. І тут калгасы — ззаду індывідуальнікаў.

Якія-ж прычыны гэтых слабых тэмпаў сяўбы?

Па-першае — недастатковая ўвага аддаецца ў некаторых мясцох індывідуальнаму сэктару. **У асобных вёсках перагібы пры зямляўпарадкаваньні яшчэ ня выпраўлены.** Ільготы за пашырэньне пасеўных плошчаў і сяўбу тэхнічных культур слаба папулярызуюцца. Дапамога калгасаў бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам усё яшчэ не прыняла масавага характару.

Па-другое — слабая арганізацыя працы і вытворчасьці ў калгасах. Няма яшчэ рашучай барацьбы з «месьніцкімі» тэндэнцыямі ўхіляцца ад сяўбы працаёмкіх культур. Няма яшчэ масавай узаемадапамогі сярод калгасаў.

16 зьезду УсеКП(б) працоўныя БССР павінны рапартаваць аб пасьпяховых выніках пасеўнай кампаніі, аб перавыкананьні пасеўных плянаў. А для гэтага—усю пасеўную прапу—на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Шырокае распаўсюджваньне павінна атрымаць дапамога калгасаў індывідуальным гаспадаркам. Кожны калгас, кожны саўгас, якія ўжо засеялі свой яравы клін, павінны перакінуць жывы і мёртвы інвэнтар на палосы бядняцкіх і маламоцных серадняцкіх гаспадарак. Гэтага патрабуе партыя, гэтага патрабуюць інтарэсы калгаснага руху і яго далейшага росту.

Неадкладна ўзмацніць тэмпы сяўбы, дабіцца рашучага зруху ў галіне тэхнічных культур і ніводнага незасеянага гектара да 16 зьезду УсеКП(б) —вось пад якімі лёзунгамі павінны прайсьці астатнія тыдні сяўбы.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб далейшай рабоце дваццаціпяцітысячнікаў

ЦК УсеКП(б) адзначае, што калгаснакаапэрацыйныя цэнтры ня выканалі пастановы ЦК аб разгортваньні работы па замацаваньні асноўнай масы 25-тысячнікаў у якасьці сталых кадраў адпаведных калгасна - каапэрацыйных сыстэм.

1. Калгасцэнтр, Хлебацэнтр, Трактарацэнтр, Маслацэнтр і іншыя каапэрацыйныя цэнтры, а таксама Наркамзем Саюзу павінны дабіцца ў бліжэйшымжа часе рашучага ўзмацненьня ўвагі ўсіх калгасна - каапэрацыйных сыстэм да гэтага асноўнага пытаньня работы з 25-тысячнікамі (правільнае скарыстаньне ў калгаснай вытворчасьці, павышэньне вытворчай кваліфікацыі, арганізацыя кансультацыі па спэцыяльных пытаньнях, арганізацыя навышанага тыпу курсаў, практыка і экскурсіі ў саўгасы, устанаўленьне сыстэматычнай сувязі з 24-тысячнікамі, хутчэйшае вырашэньне пытаньняў зарплаты і жыльлёвых, аказаньне дапамогі ў перакідцы сем'яў у вёскі і г. д.).

2. Неабходна ў бліжэйшым часе правесьці праверку сувязі і дапамогі рабочым з боку калгасных, прафсаюзных і партыйных арганізацый. Кіраўніцтва гэтай праверкай ускласьці на аддзелы агітацыі і масавых кампаній парткомаў з прыцягненьнем прафсаюзаў, РСІ, органаў Наркампрацы, лёгкай кавалерыі, ячэек УсеЛКСМ, друку і іншых.

Даручыць РСІ праверыць усе выпадкі затрыманьня пераводу зарплаты, а таксама бюракратычна - фармальных адносін раду гаспадарчых і калгасных арганізацый да рабочых-25-тысячнікаў.

3. Прыняць да ведама пастанову УсеЦСПС ад 8 мая 1930 г. аб рабоце з 25-тысячнікамі.

Паставіць перад фабрычна - заводзкімі, партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі пытаньне аб узмацненьні сувязі з 25-тысячнікамі у прыватнасьці, шляхам сыстэматычнай перапіскі, асьвятленьня работы камандыраваных у калгасы рабочых у заводзкім друку і г. д.

Фабрычна - заводзкія арганізацыі павінны таксама праверыць і забясьпечыць прадастаўленьне камандыраваным рабочым і іх сем'ям усіх прадугледжаных законам ільгот (кватэры, пасылка на працу членаў сям'і і г. д.), таксама арганізацыю пастаянна працуючых бюро сувязі пры фабзаўмясцкомах, прыцягненьня шырокай рабочай грамадзкасьці.

4. Адзначаючы, што партарганізацыі ўдзяляюць рабоце 25-тысячнікаў зусім слабую ўвагу, абавязаць акруткомы, райкомы дакладна азнаёміцца з абстаноўкай работы кожнага 25-тысячніка, прыняўшы меры для стварэньня патрэбных умоў для замацаваньня іх на рабоце. Тых з рабочых, якія ў сувязі з распадам калгасаў засталіся бяз працы, выкарыстаць у іншых калгасах. У неабходных выпадках дапускаць выкарыстоўваньне 25-тысячнікаў на іншай (каапэрацыйнай, партыйнай, савецкай) рабоце ў вёсцы.

Прызнаць магчымым, каб краёвыя і абласныя калгассаюзы (каапсаюзы) са згоды адпаведных крайкомаў, аблкомаў і акругкомаў, тых таварышоў з 25-тысячнікаў, якія аказаліся непадрыхтаванымі і не падыходзяць для кіраўнічай калгаснай работы, накіраваць або па курсы для падвышэньня ведаў, або назад — на вытворчасьць.

5. Абавязаць аддзел агітацыі і масавых кампаній ЦК забясьпечыць своячасовае азнамленьне і рэагаваньне на найбольш важныя лісты 25-тысячнікаў. Па некаторых агульных пытаньнях аказваць па гэтых лісты праз друк.

Адзначыць невыкананьне з боку цэнтральных газэт пастаноў ЦК аб узмацненьні асьвятленьня работы 25-тысячнікаў. Абавязаць культпропаддзел ЦК забясьпечыць сталае асьвятленьне іх работы, у прыватнасьці ў часе агляду, які праводзіцца.

Адзначым XIII зьезд КП(б)Б шырокай дапамогай калгасаў і саўгасаў бядняцкім і маламоцным серадняцкім гаспадаркам

Саўгасы Бабруйшчыны першымі ў БССР скончылі сяўбу

Тэхнічныя культуры усё яшчэ самае слабое месца пасеўнага фронту

Дабіцца выкананьня пляну па тэхнічных культурах

Пастанова праўленьня Белкалгасцэнтру

Апошняя зводка па пасеве яравых культур адзначае недапушчальна слабае выкананьне пляну засеву тэхнічных культур наогул і асабліва па калектыўным сэктары: усяго на 20 мая г. г. пасеяна тэхнічных культур 28,6% пляну, а ў калгасах 24 проц. плянавага заданьня.

Асабліва дрэнна ідзе пасеў у Віцебскай і Полацкай акругах, якія зьяўляюцца ільнаводнымі акругамі. Плян засеву тэхнічных культур выкананы па Віцебшчыне на 9,2 проц. і па Полаччыне на 5,5 проц., што сьведчыць па сутнасьці аб зрыве плянаў па тэхнічных культурах.

Праўленьне Белкалгасцэнтру ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1) Абавязаць акркалгассаюзы і ўсю паляводчую сыстэму безадкладна прыняць тэрміновыя захады да поўнага выкананьня пляну пасеву тэхнічных культур у калгасах, а таксама і па індывідуальным сэктары.

2) Камандыраваць членаў праўленьня Белкалгасцэнтру і Белпаляводсаюзу для праверкі выкананьня дырэктыў па пасеўкампаніі, асабліва па пасеве тэхнічных культур і дапамогі акругам арганізаваць работу на мясцох.

3) Абавязаць акркалгассаюзы і камандыраваных таварышоў дабіцца поўнага выкананьня пляну засеву тэхнічных культур.

Усіх працаўнікоў саюзаў, па віне якіх зрываецца пасеў тэхнічных культур, зараз-жа зьнімаць з працы і прыцягваць іх да судовай адказнасьці.

4) Аб ходзе пасеву тэхнічных культур і аб прынятых мерапрыемствах акркалгассаюзы павінны да 5 чэрвеня паведаміць Белкалгасцэнтр.

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру МІЦЬКОЎ.

На 15 дзён раней тэрміну

КАЛГАС «КАМУНАР», БЯРЭЗІНСКАГА РАЁНУ (МЕНСКАЙ АКРУГІ), СКОНЧЫЎ СЯЎБУ. ЗАСЕЯНА 320 ГЭКТ. ЯРАВОГА КЛІНУ. У ГЭТЫМ ЛІКУ ПАСЕЯНА КАНЮШЫНЫ 80 ГЭКТ. ТАКСАМА ПАДРЫХТАВАНА 40 ГЭКТ. ПАД ЛУБІН НА ЎГНЕНЬНЕ. **ПЛЯН СЯЎБЫ ПА ЯРАВЫХ КУЛЬТУРАХ ВЫКАНАНЫ НА 15 ДЗЁН РАНЕЙ ПЛЯНАВАГА ТЭРМІНУ.** АКРАМЯ ТАГО, У ЧАСЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ БУДАВАЛІ СЫЛНУХ НА 200 ГАЛОЎ. У ЧАСЕ СЯЎБЫ КАЛГАС ПАВЯЛІЧЫЎ СВОЙ ІНВЭНТАР НА 25 КОНЯЙ. ЦЯПЕР ЁН МАЕ 64 КАНІ. КАЛГАС СКЛАДАЕЦЦА З 40 СЯМЕЙ.

ЗАВАПНАВАНА 8 ГЭКТ., УГНОЕНА КАСЬЦЯНОЙ МУКОЙ — 40 ГЭКТ., СУПЭРФАСФАТАМ — 12 ГЭКТ., ПОПЕЛАМ — 3 ГЭКТ., ГНОЕМ — 60 ГЭКТ.

ЗАСЕЯНЫ ЗЕМЛІ 2 КУЛАЦКІХ ГАСПАДАРАК — 9 ГЭКТ. АГЛЕДЖАНЫ ПІТОМНІК, САД НА ПЛОШЧЫ 2 ГЭКТ. І 11 РАМАВЫХ ВУЛЬЛЕЎ.

СТАРШЫНЯ КАЛГАСУ **МІЦКЕВІЧ**,
ПАЛЯВОД **МАРКОЎСКІ**,
КУСТАВЫ АГРАНОМ **КРЭНСКІ**.

Масавая праца дала свае выніхі

КАПАТКЕВІЧЫ, Мазырскай акр.

Вёска Колкі налічвае 213 гаспадарак. 114 з іх увайшлі ў калгас, галоўным чынам, бядняцкіх. Калгас мае толькі 34 рабочыя коні і 12 валоў. Цягавай сілы калгасу не хапала. Але, дзякуючы ўпартай працы калгаснікаў, правільнай разьбіўцы іх на рабочыя брыгады, разгортваньню растлумачальнай працы, асабліва сярод жанчын, пасеўны плян удалося выканаць своячасова і добра з якаснага боку.

Калгас засеяў 250 гэкт. яравога кліну і дадатковых 200 гэкт., якія яму вылучылі з запаснога фонду.

Гаспадарка калгасу расьце. Ёсьць свая кузьня і сталярная майстэрня. Зроблена новых 70 рамовых вульлёў. Зімою калгаснікі зарабілі звыш 2.000 руб., за якія куплены трактарныя абавязацельствы. Восеньню калгас мае атрымаць першы трактар.

Паміж калгасам і індывідуальнікамі ўстанавіліся добрыя ўзаемаадносіны. Індывідуальнікі таксама цалкам выконваюць плян веснавой сяўбы.

Вялікую ролю адыграла мясцовая хата-чытальня, якая разгарнула растлумачальную работу сярод калгаснікаў і індывідуальнікаў. Яна добра папулярызавала мерапрыемствы партыі і ўлады ў галіне калектывізацыі і ільготы па с.-г. падатку за пашырэньне пасеўнай плошчы.

Брыгадзір «Зьвязды» А. Ш.

Ход сяўбы ў Бабруйшчыне

БАБРУЙСК. (Па тэлеграфу).

На 25-га мая Бабруйская акруга выканала плян веснавой сяўбы на 66,5 проц. Калгасы засеялі 38.348 гэкт.—76,2 проц. свайго пляну, індывідуальнікі—183000 гэкт.—68 проц. пляну.

Уперадзе ўсіх раёнаў Бабруйшчыны — Чырвона-Слабодзкі раён, калгасы якога выканалі 95 проц. пляну, а індывідуальнікі—98 проц.

На апошнім месцы — Бабруйскі раён, які даў толькі 39 проц. выкананьня пляну.

Плян сяўбы сіласных культур калгасамі выкананы толькі на 37,2 проц.

Калгасы адстаюць сяўбой бульбы—яны далі ўсяго 58 проц. пляну ў той час, як індывідуальны сэктар —68 проц.

На ільне калгасы выканалі плян на 40 проц., індывідуальнікі—44,5 проц.; па каноплях—калгасы—на 40,6 проц., індывідуальнікі—на 41 проц.

Саўгасы Бабруйскае акругі на 25 мая скончылі сяўбу. Плян імі выкананы поўнасьцю.

Насеньне сіласных культур-ляжыць на складах

У Белпаляводсаюзе нашаму супрацоўніку паведамілі, што рэалізацыя насеньня сіласных культур па БССР праходзіць вельмі дрэнна. Насеньне ляжыць на складах, бо яно не разьбіраецца.

З Воршы, між іншым, атрымана тэлеграма, што на складзе ляжыць 18 тон насеньня кукурузы, якую ні калгаснікі, ні індывідуальныя гаспадаркі не бяруць. Плян пасеву сіласных культур у Аршанскай акрузе, такім чынам, пад пагрозай зрыву.

Прыступілі да будаўніцтва

Рагачэў, Бабруйскай акр.

Калгас «Свабода», Гарадзецкі сельсавет, скончыў веснавую сяўбу.

Зараз прыступлена да будаўніцтва хлявоў. Будуць пабудаваны 2 хлявы для рагатае жывёлы, сьвінух, стайня і цялятнік. Усё гэта будзе каштаваць каа 35.000 руб.

Калгасам закуплена 40. с.-г. машын і прылад, якія патрэбны для правядзеньня ўборачнай і васеньняй пасеўнай кампаніі.

БІЗЮК.

Дапамагаюць маламоцным калгасам і бедняком

УВАРАВІЧЫ, Гомельскай акр.

Калгас «Вэкер» датэрмінова скончыў сяўбу. Замест 1 чэрвеня, як прадугледжвалася плянам, увесь яравы клін быў засеены ўжо 20 мая.

Гэты посьпех тлумачыцца вялікай зацікаўленасьцю калгаснікаў калектыўнай работай.

Зараз калгаснікі дапамагаюць бліжэйшым маламоцным калгасам і бедняком - індывідуальнікам.

МАЦНЕЙ АГОНЬ НАПРАВА

Партыя прыходзіць да XVI зьезду згуртаванымі бальшавіцкімі радамі, узброеная практыкай буйнейшых рашаючых посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Паміж XV і XVI зьездамі наступіла тое паскарэньне нашага разьвіцьця да сацыялізму, якое яшчэ прадбачыў у пачатку НЭП'у Ўладзімер Ільліч. Буйнейшыя посьпехі партыі ў справе індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі зьявіліся простым разультатам цьвёрдай ленінскай лініі ЦК, якая ажыцьцяўлялася ў суровай і непахісной барацьбе супроць апартуністычных скажэньняў ленінізму, супроць спроб сьцягнуць партыю з бальшавіцкага шляху яе палітыкі.

Сьледам за разгромам контр-рэвалюцыйнага трацкізму, які зараз варочаецца хуткім тэмпам ва ўлоньне здрадніцкай сацыял - дэмакратыі, партыя пераможна павяла барацьбу з адкрыта-апартуністычным правым ухілам, які ў абставінах разгорнутага сацыялістычнага наступленьня ў горадзе і вёсцы быў і застанецца на даным этапе галоўнай небясьпекай унутры партыі.

Партыя пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту ўнесла ў барацьбу з правым ухілам усю сваю бальшавіцкую непрымірымасьць, усю сваю ўлэўненасьць у перамозе сацыялізму ў нашым краі, увесь запал баявога авангарду пралетарскіх мас, якія кожны дзень і кожную гадзіну куюць сацыялізм уласнымі рукамі. Іменна таму так хутка і рашуча былі прыведзены правадыры правых ухілістых да капітуляцыі перад воляй партыі.

Трэба, аднак, з усёй выразнасьцю сказаць, што рад труднасьцяй узьнікшых у працэсе вастрэйшай гаспадарчай ломкі ў [illegible]цы за апошнія месяцы, памылкі «левыя» перагібы, дапушчаныя на глебе калектывізацыі некаторымі арганізацыямі партыі, узмацненьне супраціўленьня кулацтва справе рашучай сацыялістычнай перабудовы вёскі, хістаньні пэўнай часткі серадняка на глебе дапу[illegible]ых памылак і г. д., усё гэта аднавіла сякія-такія надзеі правааапартуністычных элемэнтаў, якія зноў прабуюць, ня гледзячы на поўнае сваё ідэйнае банкрутства ў вачох рабочых мас, узяць «рэванш» у партыі пры дапамозе самай агідная спэкуляцыі на труднасьцях эпохі «вялікага пералому».

Гэта мітусьлівая вазьня правааапартуністычных мудрагеляў, моцных толькі заднім розумам, напярэдадні XVI зьезду знаходзіць сваё адлюстраваньне ў паасобных выступленьнях, што прыкрываюцца, як належыць, маскай знадворнай лёяльнасьці, у дробных выпадах супроць партыі і яе ЦК, у нараджэньні ўсякіх саматужных «тэорый», якія аднаўляюць асьцярожненька па часьцях выкрытыя і адкінутыя партыяй погляды правага апартунізму.

Якія характэрныя рысы ўсіх гэтых выступленьняў, што характарызуюць нясумненнае ажыўленьне права - ўхілісцкіх тэндэнцый. Перш за ўсё тут у наяўнасьці ўсё тая неадрыўная, упасьцівая праваму апартунізму, паніка перад труднасьцямі, капітулянцкае імкненьне прадставіць усю калгасную кампанію вясны гэтага году, як «паражэньне», а пастановы ЦК па выпраўленьні дапушчаных некаторымі мясцовымі арганізацыямі і «левых» перагібаў, як адступленьне, як адмаўленьне ад пёзунгаў суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы.

Зыходзячы з гэтай капітулянцкай пазыцыі, сёй-той з таварышоў, што кульгаюць на правую нагу, варочаецца да ўлюбёнага занятку, да ўсякага роду панікёрскіх «прароцтваў».

Ня менш цікавы і спробы з боку элемэнтаў, пагардліва пакідаючых у баку такія «драбніцы», як замацаваньне дасягнутых посьпехаў калгаснага будаўніцтва і далейшае его разьвіцьцё на базе гэтага замацаваньня, як энэргічна ідучае разгортваньне калгаснай сяўбы—зноў аргумантаваць звычайнай для апартуністых спасылкай на «непадрыхтаванасьць» вёскі да масавай калектывізацыі, а партыі—да кіраўніцтва гэтым працэсам. Зусім відавочна, што тут заднім чыслом перакідваецца мосьцік да канчаткова дыскрэдытаваных у вачох партыйных мас ідэй наконт «мірнага ўрастаньня», да антыленінскага, лібэральнага тлумачэньня ленінскага каапэрацыйнага пляну і да іншых правааапартуністычных штукарстваў, меўшых месца на праходзячым этапе нашага разьвіцьця.

Апартуністычныя выпады супроць партыі, натуральна, нібы афарбаваны ў колер самай таннай і наглай дэмагогіі. Правыя апартуністыя асабліва заўзята падтрымліваюць (а часамі і «тэарэтычна» ўгрунтоўваюць) імкненьне звяліць адказнасьць за перагібы і агіднасьці, меўшыя месца ў працэсе калектывізацыі, на кіраўніцтва партыі, на Цэнтральны Камітэт. Ня гледзячы на тое, што перагібы, зьвязаныя з антысерадняцкімі «левымі» загібамі, нярэдка, аднак, зжываліся і з самай сапраўднай правааапартуністычнай практыкай, — правыя элемэнты гістэрычна заклікалі да «самакрытыкі», разумеючы пад гэтым не свае ўласныя апартуністычныя памылкі, а партыйнае кіраўніцтва. Наперакор фактам, наперакор дакумантам, па якіх кіруючая лінія ЦК у справе калектывізацыі відна, пачынаючы са студзеня 1930 году, — правыя ўсяляк стараюцца разьвіваць дэмагагічную сьвістапляску на тэму аб тым, што «ЦК недастаткова кіраваў», не праявіў «гібкасьці», «не падрыхтаваў кадраў» і г. д. і г. д. Мэта ўсёй гэтай дэмагогіі ясная: яна накіравана на дыскрэдытацыю ленінскага кіраўніцтва партыі, яна азначае імкненьне пад новай поліўкай пачаць атакі на ўнутрыпартыйны рэжым, якія зьяўляюцца нязьменнай прыналежнасьцю любой актыленінскай, дробна - буржуазнай апазыцыі, няхай гэта будзе адкрыта—правая, ці прыкрытая радыкальнай «левай» фразай.

Зусім зразумела, што да дэмагогіі наконт ЦК далучаюцца і ўсякія іншыя дэмагагічныя «дадаткі», часта глыбока меншавіцкай уласьцівасьці, накшталт таго, што трэба, бач, раней «накарміць рабочых», а ўжо потым нападжваць «усякія спаборніцтвы, ударніцтвы» і г. д.

Ня прыходзіцца і гаварыць, што побач з гэтымі «клопатамі» аб рабочых і арсэнале праваапартуністычных наскокаў на партыю, што ўзмоцніліся за апошні час, галоўную ролю адыгрывае простая абарона кулака, у адносінах якога, можаце бачыць, — ня было праўлена выстарчальнай гібкасьці. Бывае нават так, што некаторыя ня ў меру «асьцярожныя» таварышы даходзяць да вычварных антыпартыйных заяў аб тым, што раскулачваньне адбылося амаль на 50 проц. незаконна і г. д. і г. д.

Усе гэтыя праявы ўзмоцненай актыўнасьці правых ухілістых ставяць перад партыяй задачу — узмацніць сваю пільнасьць, даць рашучы адпор «новым» праваапартуністычным тэорыям, у самым зародку перамагчы права-ўхілісцкую дэмагогію, якая зноў пачынае расьпяразвацца.

Таму перад тварам узмоцненых вылазак правых напярэдадні XVI зьезду, які прадэманструе перад тварам усяго сьвету гатоўнасьць партыі ісьці з удесяцярэнай энэргіяй да новых сацыялістычных перамог, — правыя капітулянты павінны быць пастаўлены пад руйнуючы агонь.

(«ПРАВДА»).

Поўны правал нацыянал-фашыстых на дадатковых выбарах ў сойм

Ня гледзячы на надзвычайны тэрор, на лютыя арышты, на крывавыя зьбіваньні рабоча-сялянскіх кандыдатаў,—у Лідзкай акрузе і на Валыні рабоча-сялянскія сьпісы ў многа разоў павялічылі лік галасоў

Шырокія масы працоўных,—варожыя польскаму фашысцкаму ўраду і яго „дэмакратычнай“ прывесцы

ВАРШАВА, 26. Учора адбыліся перавыбары ў сойм у Лідзкай акрузе. Характэрным зьяўляецца падзявчай слабы ўдзел выбаршчыкаў. У выбарах прыняла ўдзел толькі 30 проц. выбаршчыкаў. Такія адносіны да выбараў зьяўляюцца вынікам ня толькі шырокага ўжываньня адміністрацыйнага націску, але таксама вынікам агульнага расчараваньня шырокіх мас беларускага сялянства соймам і палітыкай польскага фашысцкага ўраду.

Перадвыбарны тэрор у Лідзкай выбарчай акрузе быў разьвіты да **максымальных** разьмераў. Беларускае сялянства было зусім тэрарызавана ўладамі. Перадвыбарныя мітынгі ператвараліся вайсковымі і тайнымі агентамі паліцыі, якія прадстаўлялі «абурэньне народу», **у крывавыя бойкі.** Была створана атмасфэра, якая яўна паказвала на тое, што мясцовыя ўлады лічаць самы ўдзел у выбарах **антыдзяржаўным праступкам.** Па ўсёй акрузе прайшла **шалёная хваля арыштаў.** Быў арыштаваны ўвесь выбарчы камітэт беларускага рабоча - сялянскага аб'яднаньня «Змаганьне», лікам **50 чал.** Уся перадвыбарчая літаратура **«Змаганьне»** была канфіскавана. Многа гаворачым дакумантам лідзкіх выбараў зьяўляецца **выбарчы плякат «Змаганьне», на якім красуюцца фатаграфічныя здымкі ўсіх чатырох дэпутатаў «Змаганьне» ў цяперашнім сойме, параненых і з перавязанымі галовамі** (дэпутаты былі паранены ў часе выступленьняў на перадвыбарных мітынгах). Гэты плякат таксама быў канфіскаваны паліцыяй. Рэзультаты ў наяўнасьці: у Лідзкай акрузе з 321.000 чал., маючых выбарчыя правы, у выбарах прынялі ўдзел толькі 99.000 чалавек. Гэтыя лічбы гаворацъ самі за сябе — асноўная маса беларускага сялянства не прыняла ўдзелу ў выбарах.

Самая вялікая колькасьць галасоў папа на сьпісак польскай сялянскай партыі, якая атрымала 4 мандаты. Беларускі рабоча - сялянскі сьпіс «Змаганьне» атрымаў значны лік галасоў (па піку галасоў другі сьпіс) і атрымаў два мандаты.

Поўны правал пацярпелі беларускія нацыянал - фашыстыя, якія сабралі ўсяго 1.400 галасоў, ня гледзячы на поўнае падтрыманьне іх з боку ўрадавых органаў.

З польскіх партый блёк хадэкаў (хрысьціянскіх дэмакратаў) і Пяста атрымаў 17.000 галасоў і адзін мандат. «Вызваленьне» атрымала ўсяго 5.000 галасоў, ППС — 2.000.

З 500.000 ГАЛАСАВАЛІ 100,000

ВАРШАВА, 26. На дадатковых выбарах у сэнат на Валыні з 500.000 з лішнім выбаршчыкаў галасавала крыху больш 100.000 чалавек. Блёк нацыянальных меншасьцяй (Уидо) атрымаў 33.000 галасоў і 2 мандаты, украінскія радыкалы — 38.000 галасоў і 2 мандаты, аб'яднаны «Сельроб» — 20.500 галасоў і 1 мандат. Правы «Сельроб» сабраў усяго 3.000 галасоў. Адзіная польская партыя, выступаўшая на выбарах, «Вызваленьне» сабрала ўсяго 6.500 галасоў і засталася без мандату. (ТАСС).

Гомельскія чыгуначнікі—XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б)

На мітынгу зборнага цэху Гомельскага паравоза-вагона-рамонтнага завода імя Ланцуцкага 27-га мая 1930 г. рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал далі абяцаньне не пазьней чым да канца работы XIII зьезду КП(б)Б выпусьціць звыш праграмы адзін паравоз з сярэдняга рамонту.

Зборны цэх на сёнешні дзень вытворчую праграму выканаў поўнасьцю і сёньня-ж прыступіў да работы па выпуску звышпраграмнага паравозу ў падарунак XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б).

Сакратар партколектыву заводу імя Ланцуцкага КЛЯБАНАЎ.
Дырэктар заводу ХІМАКОЎ.
Старшыня заўкому КУЧЫНСКІ.

Па сканчэньні рамонту паравозу, на апошнім прыбудзе ў Менск дэлегацыя ад рабочых заводу з рапартам XIII зьезду КП(б)Б.

Зноў провакацыя польскіх жандараў

НА ГЭТЫ РАЗ НА ПОЛЬСКА-НЯМЕЦКАЙ МЯЖЫ

МАСКВА, 26. У ноч на 25/V, у раёне ўсходня-прускага гораду Мюнстэрвальду, адбылася сутычка наміж нямецкай і польскай пагранічнай вартаю. Паводле паведамленьня агэнцтва «Вольф», **інцыдэнт здарыўся пры арышце двух польскіх службовых асоб, незаконна перайшоўшых граніцу.** У часе рэвальвэрнай перастрэлкі паранены адзін польскі і адзін нямецкі чыноўнікі. Як падае польскае тэлеграфнае агэнцтва, польскі пагранічнік быў паранены тады, калі ён знаходзіўся на польскай тэрыторыі і толькі потым разам з другім чыноўнікам быў арыштаваны нямецкім патрулём.

Орган нямецкіх нацыяналістых «Крэйс цэйтунг» заяўляе, што паміж Нямеччынай і Польшчай яшчэ ніколі ня было такога сур'ёзнага інцыдэнта. «Дойчэ Тагесцэйтунг» лічыць, што ў наяўнасьці нячувана дзёрская правакацыя з боку Польшчы. Друк нямецкіх нацыяналістых аднадушна патрабуе, каб нямецкі ўрад «не задаволіўся звычайна бязгрунтоўнымі тлумачэньнямі польскага ўраду». Польскі пасланьнік у Бэрліне заявіў у нямецкім міністэрстве замежных спраў пратэст з поваду пагранічнага інцыдэнта і запрапанаваў зрабіць расьсьледваньне гэтага інцыдэнта на месцы пры дапамозе спэцыяльнай зьмешанай польска-нямецкай камісіі. (ТАСС).

10-цігадовы юбілей газэты „Вісти“

ЦВК БССР паслаў рэдакцыі газэты «Вісти», у сувязі з яе 10-цігадовым юбілеем, наступную тэлеграму:

«ЦВК БССР горача вітае орган ВУЦВК «Вісти» ў дзень 10-цігадовага юбілею і жадае газэце «Вісти» — піянэру украінскага савецкага друку — далейшых посьпехаў у справе садзейнасьці друкаваным словам сацыялістычнаму будаўніцтву ва УССР пад кіраўніцтвам Ленінскай камуністычнай партыі».

ДАКЛАД тав. СЛАВІНСКАГА НА VIII МЁНСКАЙ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫІ—ГЛЯДЗІ НА 2-й СТАРОНЦЫ

НАПЯРЭДАДНІ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Першы пленум Аршанскага АК КП(б)Б

Новы сакратар Акругкому тав. Кавальчук

Пасьля закрыцьця Аршанскай партканфэрэнцыі адбыўся першы пленум АК і АКК КП(б)Б. Пленум АК выбраў бюро АК. Сакратаром акругкому выбраны т. **Кавальчук**, член КП(б)Б з 1916 г. Тав. Кавальчук паходзіць з Горадзенскай губ. Па прафэсіі — рабочы-ліцейшчык. Доўгі час быў у эміграцыі (Амэрыцы), пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі доўгі час працаваў на партыйнай рабоце. У апошні час тав. Кавальчук працаваў у Маскоўскім павятовым камітэце партыі, адкуль быў пасланы на курсы марксызму.

Загадчыкам арг. інструктарскага аддзелу зацьверджан т. **Вялеска**, загадчыкам культпропу — т. **Бутар.**

Пленум АКК выбраў старшынёю АКК т. **Сьвірыдава** і адказным сакратаром т. **Стэфановіча.**

ВАШКЕВІЧ.

Закрылася Магілеўская партканфэрэнцыя

Пасьля заключнага слова т.т. **Ляўкова і Жолудзева** канфэрэнцыя заслухала даклад т. **Малашонка** аб разьвіцьці прамысловасьці ў акрузе. З дакладам аб калектывізацыі сельскае гаспадаркі і задачах партыі выступіў загадчык арг. аддзелу АК т. **Ваўковіч.**

26 мая канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыі па ўсіх дакладах.

Вечарам адбыліся выбары АК, АКК і дэлегатаў на зьезды. Канфэрэнцыю віталі №-скі кав. полк і піянэры гор. Магілева.

Усе дэлегаты канфэрэнцыі па запрашэньні рабочых наведалі фабрыку штучнага шоўку.

„Зьвязьдзе“—ад Аршанскай акрпартканфэрэнцыі

VI Аршанская акруговая канфэрэнцыя, моцна згуртоўваючы свае рады вакол генэральнай лініі партыі і вядучы барацьбу з адхіленьнямі ад яе, шле шчырае прывітаньне ЦО КП(б)Б — газэце **«Зьвязьдзе»**—барацьбіту за чыстату ленінскай лініі партыі, які своячасова мабілізуе ўвагу партыйных мас на выпраўленьне дапушчаных памылак, які вядзе рашучую барацьбу з усімі хістаньнямі і адхіленьнямі ад ленінскага шляху. Аршанскія бальшавікі запэўняюць «Зьвязду», што яны прышлі на сваю канфэрэнцыю з адпадушнай воляй і ленінскай згуртаванасьцю і вырашаць пастаўленыя партыяй задачы, што канфэрэнцыя аддасьць усе свае сілы на барацьбу з правым ухілам, самым небясьпечным па даным этапе, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх.

Няхай яшчэ боль

VIII МЕНСКАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ

НА ВАРЦЕ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ

Загартаваная ў бязьлітаснай барацьбе на два фронты як з правым ухілам--галоўнай небясьпекай, так і з „левым“ апартуізмам, з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму, Менская партарганізацыя маналітнымі калёнамі ідзе да XIII зьезду КП(б)Б

Справаздача Менскага Акруговага Камітэту КП(б)Б

ДАКЛАД тав. СЛАВІНСКАГА*)

Таварышы, паўтара года прайшло ад 7-ай Менскай акруговай партканфэрэнцыі. За гэты час акруговая партыйная арганізацыя правяла вялікую работу. Акрамя значных посьпехаў, якія мы маем у нашай рабоце, мы павінны гаварыць і аб нашых недахопах, бо бальшавіком уласьціва, галоўным чынам, зварачаць увагу на недахопы. У асаблівасьці гэта мы павінны зрабіць за справаздачны пэрыяд, калі мы дапусьцілі рад буйных памылак.

Канфэрэнцыя павінна прааналізаваць гэтыя памылкі з тым, каб глыбока ўсьвядоміць іх сутнасьць, каб мы маглі на гэтых памылках навучыцца папярэджваць іх паўтарэньне. Мы павінны правесьці справаздачу акружкому партыі пад знакам глыбокай бальшавіцкай самакрытыкі.

Разам з усёй партыяй Менская акруговая арганізацыя вяла і вядзе рашучую барацьбу на два фронты. У гэтай барацьбе мы дасягнулі вялізарнейшых посьпехаў. З чым мы падыходзім да VIII акруговай партканфэрэнцыі.

Барацьба за сацыялістычную індустрыялізацыю, за прамфінплян—барацьба за сацыялізм

Па рэспубліканскай прамысловасьці мы маем рост валавой прадукцыі за першае паўгодзьдзе 1929-30 г. на 93,3 проц., у той час, калі па ўсёй БССР гэты рост дасягае 72,1 проц. У дзяржаўнай прамысловасьці мы маем рост рабочых на 26,7 проц. Прамфінплян выканан на 95,6 проц. Гэтыя паказальнікі гаворяць аб тым зруху і аб тых тэмпах, якіх мы дасягнулі на важнейшым этапе рэканструкцыйнага пэрыяду. Мясцовая прамысловасьць таксама мае значныя паказальнікі росту валавой прадукцыі. За першае паўгодзьдзе ў мясцовай прамысловасьці мы маем рост валавой прадукцыі на 157 проц. Прамфінплян па мясцовай прамысловасьці за першы квартал выканан на 91 проц. Такім чынам, агульны рэзультат па мясцовай прамысловасьці роўны 148 проц. 36 проц. прадпрыемстваў пераведзены на 7-гадзінны рабочы дзень, 59,5 проц. прадпрыемстваў перайшлі на бесьперапынку. Па дзяржаўнай прамысловасьці рост зарплаты дасягнуў 9,2 проц., па мясцовай—8,2 проц. Намі дасягнуты добрыя паказальнікі ў скарачэньні беспрацоўя. Мы маем таксама значныя посьпехі ў абсягу сацстрахаваньня.

Гэтыя паказальнікі гаворяць аб посьпехах у нашай рабоце ў абсягу прамысловасьці, яны гаворяць аб паляпшэньні становішча рабочай клясы.

Але ў сваёй рабоце і ў далейшых мерапрыемствах, якія будуць стаяць перад нашай арганізацыяй, мы павінны ня толькі выходзіць з нашага ўнутранога становішча. Мы, знаходзячыся ў 35 клм. ад фашысцкай Польшчы, павінны ўлічваць гэта для таго, каб дабіцца максымуму посьпехаў у ажыцьцяўленьні задач, якія стаяць перад намі. Мы павінны напружыць усе свае сілы, каб у найбольш кароткія тэрміны ажыцьцявіць нашы пляны.

Адначасова з посьпехамі мы маем і значныя прарывы. Напрыклад, невыстарчальна выконваецца дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту. Якасьць прадукцыі бывае іншы раз зусім дрэнная. Калі падыйсьці да прычын прарываў у выкананьні прамфінпляну, то трэба проста па-бальшавіцку называць рэчы сваімі імёнамі. Тут мы маем непасрэдна віну з боку кіраўніцтва гаспадарчых органаў. Значная частка віны ляжыць на ВСНГ, на трэстах, значная частка віны падзецца на нашых дырэктароў прадпрыемстваў, бо да гэтага часу невыстарчальна ажыцьцяўляецца адзінаначальле і г. д. У гэтых адносінах значная частка віны ляжыць і на нашай партыйнай сетцы.

Мы маем значную частку віны непасрэдна з боку прафарганізацыі. Ня гледзячы на наяўнасьць значных посьпехаў па парт. і прафлініі, трэба сказаць, што тут ёсьць вялікія прарывы. Мы павінны рашуча ўдарыць па гэтых недахопах, па параднасьці і «очковтирательству». Вядучы рашучую барацьбу з гэтымі зьявішчамі, трэба ўзмацніць растлумачальную работу сярод рабочых мас.

У асобных выпадках рабочыя нічога ня ведаюць аб прамфінпляне і ўсё гэта таму, што яны ня маюць растлумачэньняў з боку праф. і партарганізацый.

Трэба сказаць, што такое становішча зусім ненармальнае. Тлумачыцца гэта, па-першае, невыстарчальным разгортваньнем пралетарскай самакрытыкі. Мы павінны рашуча зьнішчыць гэту коснасьць. Мы павінны дабіцца, каб аб прамфінпляне ведала ўся рабочая кляса.

Мы маем паказальныя вучасткі ў нашай рабоце, якія сьведчаць аб энтузіязьме рабочай клясы, аб адданасьці камуністычнай партыі. Гэта праяўляецца ў сацспаборніцтве. Але хаця і маем значныя зрухі ў спаборніцтве, у якое ўступаюць усё новыя і новыя групы рабочых, аднак, сацспаборніцтва нельга прызнаць у поўнай меры здаровым. Ва многіх мясцох ёсьць парадныя адносіны да спаборніцтва. Сацспаборніцтва наша партарганізацыя можа лічыць здавальняючым толькі тады, калі ўсе партыйцы і камсамольцы будуць знаходзіцца ва ўдарных брыгадах, калі яны паказ'юць ва ўдарных брыгадах прыклад бальшавіцкіх тэмпаў і камуністычных адносін да работы. Тав. Славінскі падкрэсьлівае, што яшчэ далёка ня ўсе партыйцы і камсамольцы прымаюць удзел у рабоце ўдарных брыгад. Потым т. Славінскі гаварыў аб недахопах у абслугоўваньні рабочых мас. Ён адзначыў рад прарываў у ахове працы на заводах і фабрыках, у рабоце клюбаў і г. д.

Пытаньні культурнага абслугоўваньня, у тым ліку і пытаньні беларусізацыі пастаўлены надзвычай слаба. Нашы прафсаюзы ў гэтых адносінах зусім слаба працуюць.

Рашуча выпраўляючы памылкі і скрыўленьні, замацаваць посьпехі калгаснага будаўніцтва

Я пераходжу, таварышы, да другога вучастку нашай работы на сельскай гаспадарцы. Наша партыя з усёй рашучасьцю паставіла пытаньне аб рэканструкцыі нашай гаспадаркі. Ацдым з відаў дапамогі і ўздыму ўраджайнасьці, як фактар спрыяючы гэтаму, зьяўляецца наша крэдытная палітыка па лініі сельскай гаспадаркі. Мы маем бясспрэчныя дасягненьні ў павялічэньні крэдытаваньня сельскай гаспадаркі, у справе ўздыму ўраджайнасьці сельгаспадаркі.

Размеркаваньне крэдытаў па сацыялістычным сэктарам і па індывідуальным насіла такі характар: у 1928-29 г. на сацыялістычны сэктар прыпадала 50,5 проц. крэдыту і на індывідуальны —49,4 проц. У 1929-30 годзе на сацсэктар крэдыты складалі 81,1 проц., а на індывідуальны—10,9 проц. Гэтыя лічбы гаворяць аб тым, на які шлях стала наша партыя ў сэнсе садзейнасьці, дапамогі разьвіцьцю і ўмацаваньню нашага сацсэктару. Сацыялістычны сэктар па нашай акрузе ў сельскай гаспадарцы складае 27,8 проц., гэта вялікі вучастак і гэта гаворыць аб тых посьпехах, якія дасягнуты намі ў практычнай рабоце.

Але, таварышы, трэба адзначыць, што ў нашай рабоце ў абсягу сацсэктару на вёсцы бясспрэчна мы мелі-б значна больш посьпехаў, калі-б у гэтым абсягу ня былі дапушчаны вялікія памылкі. Гэтыя памылкі заключаюцца ў перагібах лініі партыі, якія прывялі да парушэньня ў асобных мясцох саюзу паміж рабочай клясай і серадняцтвам. Мы на гэтым важнейшым вучастку работы забылі аб складанасьці і труднасьці задач, якія перад намі ўзьніклі; мы часта зьмешвалі разуменьні, часта забывалі ў гэтай практычнай рабоце, што апорай нашай партыі і рабочай клясы на вёсцы зьяўляецца бядняк і батрак, што нашым саюзьнікам на вёсцы зьяўляецца серадняк супроць нашага ворага—кулака. З-за няправільнай палітычнай ацэнкі мы мелі адпаведныя няправільныя практычныя дзеяньні, гэта выявілася ў значных перагібах у адносінах да серадняка. Мы забылі асноўную ўстаноўку Леніна аб добраахвотнасьці.

Натуральна, разуменьне добраахвотнасьці не азначае, што мы прыходзім да селяніна і пытаемся—хочаш уступаць у калгас—запішыся, а калі не—дык мы кідаем і ідзем ад яго. Мы пакідаем за сабою права пераконваць, агітаваць. Мы прыкладамі і ўсім арсэналам нашых ведаў павінны пераконваць і праз якасьць накіроўваецца да колькасьці, бо ўжо на фоне заснаванай базы, якая можа служыць прыкладам, мы здолеем папярыць работу. У нас-жа ў гэтых адносінах найшло якраз наадварот: колькасьць—па-першае, а якасьць —гэта ўжо пойдзе сама на сабе. Прычым наша асноўная база, на якую апіралася наша партыя, была ў заблытаным становішчы і трэба сказаць, што ў заблытаным становішчы яна знаходзіцца і зараз.

Работы з беднатой мы непасрэдна не вялі, а створаны прышчэпаўшчынай вораг меўся ў дастатковай колькасьці; ён быў вельмі салідным, бо Прышчэпаў за час сваёй дзейнасьці стварыў большую колькасьць хутароў, чымся іх насьпеў стварыць сам Сталыпін. Прышчэпаўшчына ёсьць практычная праява правага ўхілу. Таму, калі пішуць і гавораць, што прышчэпаўшчына зьліквідавана, а мы змагаемся з правым ухілам і «левымі» загібамі, дык я пытаю, хіба-ж прышчэпаўшчына—ня правы ўхіл у дзействе,хіба прышчэпаўшчына ня мае сваіх абаронцаў і ў вялікай колькасьці, хіба мы ня будзем весьці яшчэ доўгі час барацьбу на гэтым фронце.

Трэба сказаць, што ў гэты час кулак не вароніў, ён карыстаўся ўсімі даступнымі яму мерамі і сродкамі. Ён не прапускаў ні аднаго сродку, ні аднэй магчымасьці, каб ня выкарыстаць іх у сэнсе паслабленьня і зрыву нашых мерапрыемстваў. Калі мы возьмем тыя мэтады дзеяньня, якія ўжываў кулак у барацьбе супроць нашых мерапрыемстваў, дык мы гэта ўбачым.

Мы павінны рашуча гаварыць аб памылках, бо памылка адрозьніваецца ад памылкі: адны рабілі памылкі не разумеючы, другія іх рабілі сьвядома і ў гэтых адносінах мы павінны адрозьніваць гэтыя памылкі і рашуча ўдарыць па тых, якія сьвядома скажалі партыйную лінію. Мы павінны рашуча расправіцца з імі да канца. Калі мы гэтага ня зробім, то мы будзем мець ня посьпехі ў нашай рабоце, а мы можам мець на асобных вучастках паражэньні.

Акруговы камітэт партыі таксама аказаўся не без граха ў пытаньні аб дапушчаных памылках, ня гледзячы на тое, што мы правільна разумелі лінію партыі, але на асобных вучастках мы пасьлізнуліся і дапусьцілі грубейшыя памылкі. На аб'яднаным пленуме АК і АКК, акругком падагуліў балянс сваёй работы і выявіў гэтыя дапушчаныя памылкі.

Мы іх адносім да наступных момантаў: перш за ўсё.

1. «Вызначэньня процанту калектывізацыі для асобных раёнаў». Мы лічым, што тут зрабілі памылку ў тым, што дэкларавалі асобныя раёны суцэльнай калектывізацыі, бо гэта аб'ектыўна давала магчымасьць гнаць для таго, каб апраўдаць сваю назву.

2. Вызначылі два раёны суцэльнай калектывізацыі без дастатковага ўліку эканамічных магчымасьцяй гэтых раёнаў.

3. Прынялі выклік Мазырскай партарганізацыі па спаборніцтва па колькасных паказальніках.

Мы лічым сябе вінаватымі за невыстарчальна рашучае і своячасовае рэагаваньне на скрыўленьне лініі партыі і памылкі, якія дапускаліся асобнымі работнікамі і арганізацыямі ў калгасным будаўніцтве, у рэзультаце чаго гэтыя памылкі яшчэ больш паглыбляліся.

Не зацёсьці рашуча і пасьлядоўна супроцьставілі няправільную арыентацыю у паасобных выпадках пізавых арганізацый і асьвятленьне лініі партыі ў калектывізацыі і насеўнай кампаніі нашымі цэнтральнымі газэтам—«Зьвяздой», «Бел. Вёскай», «Акцябром» і інш. Мы ў гэтых адносінах узьнімалі голас пратэсту, але ня былі выстарчальна рашучымі. Аднак, гэтыя газэты зьяўляюцца ня толькі органамі ЦК, але і Менскага АК. Мы невыстарчальна рэагавалі і прызнаем гэта, як адзін з недахопаў нашай работы, як сваю слабасьць, і мы гэта асудзілі.

Вось прыкладна тая група памылак, якія АК трэба ставіць перад канфэрэнцыяй, якія павінны быць глыбока прапрацаваны. Мы павінны супольна дабіцца таго, каб пазбавіцца ад іх і ў далейшым папярэдзіць іх паўтарэньне.

Мы маем і злосныя перагібы. Напрыклад, Грэскі раённы камітэт партыі ня стаў на шлях рашучага выпраўленьня перагібаў. Мы павінны былі правесьці мерапрыемствы, накіраваныя да ліквідацыі такога становішча. Былі прарывы і ў Плешчаніцкім раёне. Тое-ж самае было і ў Самахвалавіцкім раёне.

Зараз, калі мы зрабілі, як трэба пераграску, калі мы паслалі кіраўнічых работнікаў па раёнах, работа пайшла на добры лад. Мне здаецца, што ў нас ня будзе недасеву, а нават будзе зямля засеяна з перавышэньнем.

Мы павінны ўзьняць работу з батрацтвам унутры калгасаў і павесьці рашучую барацьбу з кулацтвам. Мы павінны разьвіваць і ўзмацняць калгасы. Зараз па гэтым шляху ісьці будзе значна лягчэй, бо мы адкінулі ўвесь непатрэбны хлам. Мы павінны і ў далейшым весьці рашучую барацьбу з кулацтвам. Мы павінны ліквідаваць кулацтва, як клясу, на базе суцэльнай калектывізацыі.

Гэты працэс працягваецца і гэта работа стаіць перад намі. Але мы будзем мець і маем у сучасны момант надзвычай вялікае супраціўленьне, прычым яно ідзе па лініі падпалаў, па лініі шкодніцтва. Мы павінны ўсімі мерамі, усімі сродкамі імкнуцца да таго, каб забясьпечыць гэта па-сапраўднаму.

Правыя элементы будуць імкнуцца весьці рашучы напор на нашу партыю. Мы павінны быць узброены ў выстарчальнай меры для таго, каб даць рашучы адпор у патрэбны момант.

За апошні год мы маем пашыраныя саўгасы. Арганізавана 5 новых саўгасаў на плошчы 5.000 гэкт. У старых саўгасах плошча пашырылася на 16 проц., а плошча новых калгасаў пашыраецца да 49,3 проц.

За апошні час на саўгасы зварачаецца ўвага. Мы маем павялічэньне жывёлагадоўлі на 78 проц. Арганізавана 10 машына - конных станцый. Ёсьць некаторы рост трактараў, а таксама павялічэньне конскага складу. Гэты вучастак работы трэба значна пашырыць.

У абсягу сельскай гаспадаркі мы будзем разьвіваць і ў далейшым будаўніцтва новых саўгасаў. Але для таго, каб нашы саўгасы маглі стаць сапраўднымі фабрыкамі, трэба зьмяніць стары прышчэпаўскі мэтад кіраўніцтва саўгасамі. Празьмерная цэнтралізацыя, рамкі, у якіх яны працуюць, ствараюць вялікія затрудненьні ў далейшым пасьпяховым нармальным разьвіцьці і пастаноўцы работы.

З другога боку, зусім інакш павінна быць пастаўлена работа нашых раённых камітэтаў партыі ў сэнсе палітычнага кіраўніцтва і ўплыву на даны абсяг нашай прамысловасьці.

Саюз рабзямлес зьяўляецца невыстарчальным для таго, каб справіцца з гэтай работай. А адсюль адсталасьць рабочых данага абсягу нашай прамысловасьці, што патрабуе большай увагі з боку партыйнай арганізацыі, якая аб гэтым павінна сур'ёзна паклапаціцца.

За ўдарныя тэмпы работы на ўсіх франтох і вучастках сацыялістычнага будаўніцтва

Пытаньне аб забесьпячэньні нашага сацыялістычнага сэктару ў сэнсе кіраўніцтва высоўвае сур'ёзнейшым чынам пытаньне аб кадрах. Мы павінны з усёй шчырасьцю заявіць, што работа па падрыхтоўцы кадраў пастаўлена ня пляновым парадкам, а кампанейскім. Калі ішоў бурны рост калгасаў, тады імкнуліся займацца гэтым пытаньнем і займаліся сяк-так і Калгасцэнтр, і Наркамзем, і партарганізацыя. У сучасны-ж момант пытаньне аб кадрах ахаладзела. Між тым сацыялістычны сэктар патрабуе да сябе вялізарнейшай увагі, ён патрабуе ўліку, а яго ў нас няма. Гэта зьяўляецца адным з хваравітых зьяў, якая будзе тармазіць калгасны рух, і гэта можа стварыць рад хістаньняў на фронце клясавай барацьбы ў сэнсе развалу калгасаў звонку і з сярэдзіны. Тут мы можам мець і растраты, што пры дрэннай пастаноўцы ўліку можа вельмі кепска адбіцца на гаспадарцы. Такім чынам, гэтае пытаньне набывае зараз надзвычай вялікае значэньне. Я лічу, што на гэтым трэба завастрыць пытаньне і ў пастановах нашай канфэрэнцыі на гэтым павінен быць зроблен упор.

У абсягу работы на вёсцы мы маем станоўчы бок у тым, што гэтай работай занялася рабочая кляса.

Мы маем значныя посьпехі ў вытворчым шэфстве: на шэфработу вылучана звыш 500 чал., пабудавана 8 майстэрань. Такім чынам, прафсаюзы сталі на шлях пераходу ад культурнага шэфства да вытворчага. Гэты мэтад работы, ня гледзячы на рад недахопаў, у прынцыпе сябе апраўдаў, і яго трэба шырэй разьвіваць, паляпшаць і тады гэта будзе сапраўдная змычкай паміж рабочымі і працоўнымі масамі сялянства, мы будзем мець непасрэдны ўдзел мас у будаўніцтве, і тут узмацняецца роля кіраўніцтва рабочае клясы па вёсцы

Аднак, у сельскай гаспадарцы ёсьць і значныя недахопы. Гэтыя недахопы меш нас непакояць па лініі травасеяньня і насеннаводзтва, бо тут мы сяк-так з задачамі спраўляемся. Але, калі закрануць жывёлагадоўлю, то тут мы маем сур'ёзныя недахопы.

Такое становішча зьяўляецца пытаньнем сур'ёзным, гэта зьвязана з пытаньнем рабочага забесьпячэньня, гэта вырашае лёс выкананьня прамфінпляну, якасьці прадукцыі, выхаваньня кадраў, забесьпячэньня рабочай і вузаўскай моладзі і г. д. Вось чаму канфэрэнцыі павінны аддаць гэтаму пытаньню выключную ўвагу. Сыняцца на тым узроўні, на якім мы зараз знаходзімся, ў сучасны момант нельга. Гэта пытаньне павінна быць пастаўлена, як адзін з важнейшых палітычных прынцыпаў.

Па лініі кантрактацыі таксама справа стаіць ня зусім добра. Калі па кантрактацыі пасенных культур мы выходзім параўнаўча здавальняюча, хаця плян кантрактацыі выканан ня поўнасьцю, дык па кантрактацыі жывёлагадоўлі мы маем вялікія прарывы. На якія галіны жывёлагадоўлі трэба зварачаць галоўную і выключную ўвагу. Мы павінны аддаць вялікую ўвагу на сьвінагадоўлю, што можна зрабіць параўнаўча лёгка пры выстарчальнай разгорнутай кампаніі, пры правільным падыходзе і г. д. Мы павінны напружыць вялікія сілы для разьвіцьця іншых галін жывёлагадоўлі, напрыклад, птушніцтва, якое павінна заняць адзін з важнейшых вучасткаў у рабочым забесьпячэньні, а таксама гадоўля трусоў. На вялікі жаль, савецкія гаспадаркі тэтым пытаньнем займаюцца надзвычай мала. Нам патрэбна прыняць усе меры, напружыць усе сілы і сродкі, каб зьмякчыць становішча з забесьпячэньнем гарадоў.

У рабоце нашай каапэрацыі ёсьць некаторыя дасягненьні. МЦРК, напрыклад, мае рост пайшчыкаў на 37 прац., збор паёў — 106 проц., рост паявога капіталу — 114 проц., рост звароту ў мінулым годзе — 23.519.000 руб., у гэтым годзе за 5 месяцаў — 14.636.000 руб. Але тым ня менш, рабочы бюджэт не ахоплен поўнасьцю, а толькі на 80 процантаў, што не гарантуе рэальнай зарплаты. Слаба пастаўлена работа з арганізацыяй адкормачных пунктаў і прыгарадных гаспадарак.

Па лініі спажывецкай каапэрацыі мы маем некаторыя дасягненьні. Колькасьць пайшчыкаў вырасла на 54 проц., паявы капітал — на 122 проц., збор паёў — на 37 проц. Беднота каапэравана толькі на 90 проц., а батрацтва—толькі на 70 проц. Гэта ў той час, калі асноўная сіла, асноўная апора нашай вёскі — гэта бядняк і батрак. Тут нельга спасылацца на аб'ектыўныя прычыны. Віна за няпоўнае каапэраваньне бядняцка - батрацкіх мас непасрэдна ляжыць на арганічных недахопах нашага каапэрацыйнага апарату.

Мы мелі засьмечанасьць інвалідной каапэрацыі, чужымі варожымі нам элемэнтамі. Таксама мы мелі буйнейшыя прарывы ў саматужна - прамысловай каапэрацыі, дзе кіраўніцтва па непасрэдных дырэктывах яўбюро ЦК і АК праводзіла лінію, якая не адпавядала лініі партыі. ЦК КП(б)Б выправіў гэта, асудзіўшы памылкі, была праведзена чыстка. Акруткам, правяраючы саматужна - прамысловую каапэрацыю, стаў на шлях роспуску праўленьня, бо яно ў значнай частцы аказалася нездольным выконваць дырэктывы партыі.

Далей пытаньне аб збожжазагатоўках. Гэту работу мы выканалі з надзвычайна вялікім энтузіязмам і ў кароткі тэрмін. Мы па калгасах і саўгасах маем уклады ў дзяржаўныя сьвірны, у параўнаньні з мінулым годам на 24,9 проц. У сацыялістычным сэктары мы маем рост у параўнаньні з мінулым годам на 364,7 проц.

У галіне асьветнай работы ёсьць значныя посьпехі. Расьце колькасьць нізэйшых школ. У 1928-29 г. мы мелі 967 чатырохгодак, а ў 1930 годзе—1334. Кантынгент вучняў павялічыўся больш чым на 4.000 чал. і ахапляе 66.946 чалавек моладзі. Ёсьць значныя посьпехі і ў ліквідацыі няпісьменнасьці. Але гэтыя посьпехі не дасягаюць таго, што мы павінны мець.

Мы маем некаторую частку пастаўнікаў, якія ня зусім адданы савецкай уладзе, якія выхоўваюць дзяцей ня так, як трэба, але пераважная большасьць настаўнікаў выхоўвае моладзь у ленінскім духу.

Мы павінны і ў далейшым чысьціць непатрэбныя і варожыя нам элемэнты, якія знаходзяцца ў нашых школах. Мы павінны зьмяніць формы і мэтады і праграму ў сэнсе далейшага разьвіцьця і ўмацаваньня сацыялістычнага сэктару. Аб рабоце нашых савецкіх органаў. У сучасны момант ёсьць значнае паляпшэньне і ажыўленьне работы сельскіх саветаў у параўнаньні з папярэднім складам. Аднак, у шмат мясцох савецкі апарат аказаўся пяздольным і плёўся ў хвасьце, ня было арганізавана батрацтва і беднота. На сёньняшні дзень яшчэ не разгорнута як сьлед масавая работа. Сельсаветы часамі замест таго, каб стаць праваднікамі задач нашай партыі, задач рабочае клясы, быць сапраўднымі органамі дыктатуры пралетарыяту, у некаторых мясцох пляліся ў хвасьце. Чужыя элемэнты імкнуліся скарыстаць такое становішча.

Пры перавыбарах сельскіх саветаў мы мелі значнае ажыўленьне ў сэнсе яўкі на перавыбарчыя сходы. Аб рабоце сярод жанчын. Гэта работа часамі трактуецца, як работа толькі жанадзела. Гэты вучастак работы павінен быць бясспрэчна палепшаны.

Былі перагібы і ў адносінах пазбаўленьня выбарчых правоў.

Мы павінны вельмі настойліва і бяз усякіх хістаньняў выпраўляць нашы памылкі.

Далей таварышы, мы маем посьпехі і ў галіне бюджэту. Ёсьць значнае пашырэньне сельскіх і местачковых бюджэтаў. Мы перайшлі межы вышэй, чым гэта было ўстаноўлена напярэднім плянам, што зьяўляецца аднэй з нашых станоўчых работ. Мы маем значныя посьпехі ў галіне выпісканьня прыватнага капіталу, але нам трэба і ў далейшым зварачаць увагу на асобныя вучасткі гэтае работы.

Возьмем зварот сродкаў. Мы часта маем невыстарчальны зварот сродкаў. Па абавязковым страхаваньні мы маем выкананьне толькі на 94,47 проц. Самаабкладаньне праведзена даволі добра, але мы маем агідныя адносіны ў сэнсе скарыстаньня гэтых сродкаў. Сродкі сабраны, ляжаць на мясцох бяз усякага руху, не скарыстоўваюцца на важнейшыя патрэбы. Да гэтага часу скарыстана толькі 29,59 проц. Хіба гэта ёсьць агітацыя за далейшае правядзеньне самаабкладаньня сярод сялянства для дапамогі дзяржаве? Калі мы так будзем дзейнічаць на гэтым важнейшым вучастку нашай работы на вёсцы, дык мы ня зможам зацікавіць і давесьці на справе, што гэта кампанія праводзіцца на карысьць самога-ж насельніцтва.

Надзвычай нездавальняюча прайшла ў нас кампанія зьбераженьняў. Выканана толькі 48,3 проц. заданьня, а па вёсцы толькі 33,9 проц. Праўда, на другім вучастку гэтае галіны мы маем добрыя зьявішчы — я маю на ўвазе кампанію пазык. Па папярэньні пазык мы выканалі кантрольныя лічбы на 158,7 проц. Тут трэба канстатаваць вялікі посьпех. Але гэта толькі сума падпіскі. Сума-ж рэалізацыі некалькі іншая. Процант рэалізацыі ня зусім здавальняючы.

Скідка 3-й пазыкі індустрыялізацыі выяўляецца па групе рабочых і служачых у 0,8 проц., па групе сялян — 3,5 проц. і па групе саматужнікаў — 3,5 проц. Гэта таварышы, ужо салідны процант. Мы павінны ўмець ня толькі агітаваць на пазыку. Гэта толькі частка работы, мы павінны памятаць, што нам трэба ўмець замацавацца на гэтым вучастку работы, мы павінны ўтрымацца на дасягнутых пазыцыях і ісьці хуткім крокам далей, наперад, замацоўваючыся, паглыбляючыся. Мы маем дастатковы энтузіязм рабочае клясы і асноўнай масы сялянства, але ў нас яшчэ слаба разгорнута палітычная работа. Усе нашы кампаніі, якія мы праводзім, праходзяць неяк па-кампанейску: сёньня мы праводзім кампанію, заўтра мы аб ёй ужо мала думаем, а пасьлязаўтра яна ўжо забыта. Трэба кампаніі нашы пераплятаць з практычнай работаю, з штодзённай нашай дзейнасьцю, каб гэтыя кампаніі былі ўвязаны, каб яны зьяўляліся зьвенямі адзінага ланцугу, у якім адно нанізваецца на другое і дзе ўсё служыць адной і той-жа мэце, пастаўлена нашай партыяй, якія праходзяць чырвонай ніткай праз усё наша будаўніцтва. Вось гэтаму яшчэ мы не ў выстарчальнай ступені навучыліся і гэты прабел трэба папоўніць.

Пераходжу да пытаньняў вайсковай работы. Мы маем значныя посьпехі ў галіне гэтае работы. Нам трэба значна пашырыць гэту работу, паглыбіць і палепшыць яе.

Хаця міжзборавая работа ў нашай арганізацыі ў гэтым годзе прайшла лепш, чым раней, але і тут ёсьць недахопы ў выкананьні важнейшых пастаноў нашай партыі. Напрыклад, мы ня выканалі задач па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод пераменьнікаў, што зьяўляецца адным з мінусаў нашай работы, які трэба выправіць.

Вялікае значэньне ў рабоце мела вярбоўка ў вайсковыя школы. Мы з гэтай работаю справіліся.

За ленінскую лінію ў нацпытаньні

Адным з важнейшых вучасткаў нашай работы зьяўляецца работа сярод нацменшасьцяй. Тут трэба проста сказаць, што мы асаблівых посьпехаў на гэтым вучастку ня маем.

Мы за гэты пэрыяд мелі вылазкі нашых клясавых ворагаў, якія (вылазкі) выяўляліся ў антысэмітызьме, у вялікадзяржаўным шавінізьме, у беларускім шавінізьме і нацыянал - дэмакратызьме.

Мы мелі такую паласу, калі нацыянал - дэмакраты лічылі нашу партыю пэрсонай, супроць якой можна выступіць, а потым прысьці з заявай і сказаць: «выбачайце» і лічыць, што гэтым вымуштаным «выбачайце» ўсё памылкі выпраўлены.

Мы маем сваю пралетарскую інтэлігенцыю і можам яе супроць паставіць нацыянал - дэмакратам, якія лічылі, што яны зьяўляюцца манапалістымі ў гэтай справе. Мы паставілі пытаньне аб тым, што час дэклярацый і заяў мінуў. Нас дэкларацыі і заявы ўжо не здавальняюць — нам справа патрэбна. Нам патрэбна ліквідацыя памылак да канца. Або з намі, або супроць нас. Мы вялі рашучую барацьбу з Жылуновічам, які зьяўляўся рупарам нацыянал - дэмакратаў, якога нацыянал - дэмакраты скарысталі ў барацьбе з нашай партыяй. Мы павялі супроць яго барацьбу і ня спыніліся нават перад выключэньнем яго з партыі.

Мы сустрэліся з вылазкамі нацыянал-дэмакратаў у асобе Ільлючонка, Цьвікевіча і іншых, якіх мы таксама выкінулі з партыі.

І калі мы іх выключылі з партыі, дык яны сталі прыходзіць да нас з такой пастаноўкай пытаньня: — «Вы нас выключылі з партыі, але мы вам зараз падаем заяву». Іншы раз гэтыя людзі прыходзілі з трымя заявамі, прычым адна заява посіць тон простага «выбачайце». Мы, азнаёміўшыся з гэтымі заявамі, гаварылі, што нас гэта не задавальняе, тады падаецца другая заява, якая таксама гаворыць «выбачайце», але нас яна таксама не задавальняе, для нас яна нікуды ня варта. І вось тады ўжо падаецца трэцяя заява.

Мы ў ідэалёгічнай барацьбе ставім пытаньне так: або за нашу партыю, або супроць партыі. І, такім чынам, праводзячы рашучую барацьбу мы дабіваліся ад некаторых, і ў тым ліку ад Жылуновіча, поўнага прызнаньня.

Нацыянал-дэмакраты ставілі пытаньне так, што «ў разгар вайны прыехалі бальшавікі Фрунзэ, Мясьнікоў і інш. і калі выбухла рэвалюцыя, якую стварылі дробна-буржуазныя партыі, бальшавікі скарысталі гэта і стварылі сваю бальшавіцкую партыю». А якую ролю партыя адыгрывала да 1917 г.? Чым зьяўлялася наша партыя раней? Пра гэта не гаварылася. Мы патрабавалі ў гэтых адносінах яснага разуменьня, яснай устаноўкі. Бо першы зьезд нашай партыі, якая цяпер зьяўляецца Усесаюзнай, быў у Менску.

Мы, не ідучы на ніякія кампрамісы і вядучы рашучую барацьбу на ідэалёгічным фронце, маем значныя посьпехі. Але барацьба ня скончана, яна працягваецца, вылазкі на асобных вучастках мы маем. У гэтых адносінах мы павінны быць асабліва пільнымі, наша партыя павінна быць тэарэтычна ўзброенай. Мы павінны і надалей бязьлітасна змагацца з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з шавінізмам усіх колераў.

Мы толькі такім чынам здолеем даць рашучы адпор і захаваць нашу пільнасьць, не дапусьціць да спаўзаньня з ленінскай лініі ў нацыянальным пытаньні. На асобных вучастках мы маем няўважлівыя адносіны і часамі пачынаем барацьбу тады, калі ўскрываецца цэлы букет, прычым мы маем такія зьявішчы, якія мелі месца ў часе юбілею Белдзяржвыдавецтва. Гэты юбілей можа расцэньвацца намі, як пратэст супроць таё барацьбы, якая вядзецца партыяй у адносінах да нацыянал-дэмакратаў, бо чым іншым вытлумачыць тое, што ўсе партэты рэвалюцыйных правадыроў зьніклі, заля дэкаруецца ў паўжалобны выгляд, праўда, яна прыгожа дэкаруецца, высьлізгае і адхіляецца рабочая кляса. А калі наш пленум АК зьвярнуўся, каб яму дазволілі прысутнічаць на гэтым вечары пяцігадовага юбілею, дык кіраўнік вечару адказаў: «раз пленум акруткому партыі хоча прыняць удзел, дык ім можна адвесьці месца дзе-небудзь на галёрцы», у гэты-ж час «расфуфыраныя» дамы, упрыгожаныя ўсімі колерамі, сядзелі далёка не на галёрцы і ўздыхалі: «... ах, як цяжка жывецца пры савецкай уладзе, а колькі яшчэ будзе пакуты, як доўга гэта будзе працягвацца».

Нам прышлося са ўсёй рашучасьцю рэагаваць на падобнага роду антыпартыйную дэманстрацыю як адказ на нашу барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам. Мы паставілі пытаньне перад ЦК аб прыняцьці мер, каб такое кіраўніцтва БДВ было зьнята.

Мы вялі барацьбу са ўсякімі адхіленьнямі і ў яўрэйскай літаратуры. З гэтымі адхіленьнямі вялася значная барацьба, усе прарывы, меўшыя тут месца, былі выяўлены. Гэта надзвычай важны вучастак нашай работы, на якім мы маем значныя посьпехі. Аднак, ёсьць і прарывы, і для таго, каб мець значныя посьпехі, неабходна работу сярод нацменшасьцяй паставіць на належную вышыню і забясьпечыць партыйным кіраўніцтвам. Мы павінны нашу партыйную і савецкую літаратуру арганізаваць і прасунуць у шырокія гушчы мас, якія павінны азнаямляцца, бліжэй зрошчвацца ў адзіную сям'ю пад кіраўніцтвам нашай партыі.

Узмацніць клясавую баяздольнасьць камсамолу

Наш камсамол вырас больш чым на 5.000 чалавек. Але адначасова, ёсьць і значны недахоп у тым, што колькасьць рабочых у камсамоле зьменшылася, а сялянская праслойка павялічылася. Гэта становішча зьяўляецца ня зусім нармальным, як відаць, уплыў камсамолу на асобных прадпрыемствах невыстарчальны і што камсамол на асобных вучастках не пасьпяваў за тэмпамі сацбудаўніцтва, а цягнуўся ў хвасьце. У сацспаборніцтве камсамол у патрэбнай меры не стаяў на чале хаця ён і зьяўляўся ініцыятарам спаборніцтва. 100-процантнага ахопу рабочай моладзі камсамолам няма. У галіне калектывізацыі, а таксама і веснавой пасеўнай кампаніі збоку камсамолу мелі месца значныя прарывы. Асобныя камсамольскія арганізацыі, замест таго, каб быць памочнікам нашай партыі ў правядзеньні мерапрыемстваў часамі ўстаўлялі палкі ў калёсы, часамі тармазілі, а іншы раз выступалі супроць мерапрыемстваў па калектывізацыі. Камсамол павінен значна ўзмацніць сваю работу. Натуральна, што парткіраўніцтва камсамолам павінна быць яшчэ больш узмоцнена.

Аб жанрабоце я часткова гаварыў. Мы маем значныя посьпехі, як рост колькасьці дэлегацкіх сходаў, як рост дэлегатак, павялічэньне процанту батрачак, работніц і калгасніц на дэлегацкіх сходах і г. д. Але

Да XIII зьезду КП(б)Б

КП(б)Б—ЗА АЖЫЦЬЦЯУЛЕНЬНЕМ ЗАДАЧЫ ПА ВЯРБОУЦЫ У ПАРТЫЮ ПЕРАДАВЫХ РАБОЧЫХ І БАТРАКОУ

За пэрыяд паміж XII і XIII зьездам КП(б)Б прыняла ў свае рады 10391 перадавых пралетараў, батракоў, с.-г. рабочых і калгасьнікаў, якія даказалі сваю адданасьць партыі ў барацьбе з кулацтвам на фронце калектывізацыі

Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі, нлўхільна праводзячы генэральную лінію партыі, рашуча змагаючыся з усялякімі скажэньнямі лініі партыі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, на падставе разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі і правядзеньня ўпутрыпартыйнай дэмакратыі, выкрываючы і выпраўляючы дапущчаныя памылкі і перагібы ў паасобных галінах работы,—рашуча ажыцьцяўляла ленінскі прынцып аб папаўненьні радоў партыі перадавымі рабочымі. Пытаньне вярбоўкі перадавых рабочых у партыю трэба разглядаць у сувязі і з пунктэм гледжаньня задач сучаснага пэрыяду ўзмацненьня сацыялістычнага будаўніцтва і перамаганьня ў «апошній і рашучай схватцы», рэштак капіталізму, якія супраціўляюцца, выкарчоўваючы карэньні, што да гэтага часу жывілі капіталізм.

Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б), XII зьезд КП(б)Б і наступныя пленумы ЦК КП(б)Б паставілі задачу, каб да канца 1930 году разам з Уссаюзнай Камуністычнай партыяй у КП(б)Б было ня менш паловы яе складу рабочых ад варштату, батракоў і с.-г. рабочых. Таму было ўхвалена забясьпечыць у працягу бліжэйшых двух год у складзе прынятых у партыю ня менш 80 проц. (90 проц. па Менскай, Віцебскай і Гомельскай акругах і 70 проц. па іншых) рабочых ад вытворчасьці, уцягваючы ў партыю перадавыя элементы з рабочае клясы, асабліва з вялікім вытворчым стажам, разгарнуўшы да гэтага адпаведную арганізацыйна-практычную і ідэёва-выхаваўчую работу ў рабочых масах.

Падыходзячы да свайго XIII-га зьезду, КП(б)Б павінна праверыць, як выканана гэта важнейшая дырэктыва партыі і як асобныя партыйныя арганізацыі спраўміліся з ажыцьцяўленьнем гэтых задач?

Падводзячы вынікі гэтай работы, асабліва за пэрыяд праверкі і чысткі радоў КП(б)Б, трэба сказаць, што КП(б)Б з выкананьнем гэтай задачы ў асноўным справілася.

За пэрыяд ад XII-га да XIII-га зьезду КП(б)Б, у выніку разгорнутай работы партарганізацый сярод рабочых мас, пралетарыят БССР, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарны рух, даводзячы сваю адданасьць справе сацыялістычнага будаўніцтва, перадаваў у сталёвыя рады бальшавікоў сваіх лепшых таварышоў, ударнікаў, старэйшых рабочых—барацьбітоў за Кастрычнік. **За 15 месяцаў ад XII-га зьезду прынята ў рады КП(б)Б—10.391 чал., з ліку якіх 7.986, або 76,9 проц. зьяўляюцца рабочымі ад варштату.**

Дэманструючы сваю адданасьць справе Леніна, імкненьне ў радох партыі агульнай воляй рабочае клясы забясьпечыць непахіснасьць ленінскіх прынцыпаў у рабоце па сацыялістычным будаўніцтве,—найбольшы прыліў у партыю рабочых і работніц быў у ленінскія дні. З агульнага ліку прыёму **толькі ў ленінскія дні ўступіла ў партыю рабочых ад варштату 3.200 чал.**, што складае 81,4 проц. усяго прыёму за гэты квартал. Гэты вялізарны прыліў рабочых у партыю ў ленінскія дні сьведчыць аб поўным падтрыманьні рабочай клясай генэральнай лініі партыі.

За гэты-ж пэрыяд КП(б)Б мае некаторыя посьпехі і па ўцягненьні ў партыю батракоў, с.-г. рабочых і давёўшых сваю адданасьць партыі ў барацьбе з кулацтвам за калектывізацыю вёскі—калгасьнікаў. За гэты час **прынята ў КП(б)Б батракоў і с.-г. рабочых 1.063 чал.**, што складае 10,2%, усяго прыёму, а ў параўнаньні з прыёмам 1928 г. больш на 749 чал. За гэты-ж час у КП(б)Б прынята 741 чал. сялян-калгасьнікаў, што складае 65 проц. усяго прыёму сялян.

Адносна прыёму і ўцягненьня ў партыю батракоў і с.-г. рабочых XII-ты зьезд даў дырэктыву, каб пры прыёме ў вясковыя арганізацыі было забясьпечана ня менш чым 50 проц. батракоў і с.-г. рабочых. Гэта дырэктыва XII-га зьезду, трэба з усёй бальшавіцкай рашучасьцю прызнаць, у сувязі са слабасьцю работы сярод батрацтва і с.-г. рабочых і невыстарчальнай увагай да іх выхаваньня з боку вясковых арганізацый,—ня выканана. Надыходзячы XIII зьезд КП(б)Б павінен улічыць гэты буйнейшы недахоп, вызначыць шляхі далейшай работы з тым, каб партыйныя арганізацыі зрабілі рашучы пералом у разгортваньні выхаваўчай масавай работы сярод батрацтва і с.-г. рабочых і каб гэта дырэктыва выконвалася з усёй бальшавіцкай рашучасьцю. Бо ад выкананьня гэтай дырэктывы залежаць у значнай ступені далейшыя посьпехі сацыялістычнай перабудовы сельскае гаспадаркі, посьпехі выкарчоўваньня карэньняў капіталізму ў вёсцы, залежыць правільнае ажыцьцяўленьне лініі партыі па калектывізацыі, посьпехі замацаваньня далейшага саюзу з серадняком.

Гаворачы аб вярбоўцы батракоў і с.-г. рабочых у партыю, нельга не паказаць на асобныя арганізацыі, якія дапусьцілі нядбайнасьць у выкананьні гэтай дырэктывы XII-га зьезду КП(б)Б. Так, у Віцебшчыне процант прыёму батракоў і с.-г. рабочых у вясковых арганізацыях даходзіць да 20, па Магілёўскай акрузе —да 24 проц. І самае горшае становішча па ўцягненьні ў партыю батракоў і с.-г. рабочых у Полацкай арганізацыі. Там процант прыёму батракоў і с.-г. рабочых не перавышаў 9 проц. За першы квартал (студзень, люты, сакавік месяцы бягучага году). **Полацкая акруговая арганізацыя прыняла толькі... аднаго чалавека па групе батракоў і с.-г. рабочых.**

КП(б)Б слаба расла за лік камсамолу.

XII-ты зьезд КП(б)Б у гэтым цытаньні даў дырэктыву: «узмацніць вярбоўку рабочай моладзі ў партыю, якая прайшла сур'ёзную школу ЛКСМ на прамысловых прадпрыемствах».

Але ў сувязі з неразгорнутасьцю масавай работы на падрыхтоўцы камсамольцаў у партыю і дрэннай перабудовай работы ЛКСМ на вытворчасьці, практычнае ажыцьцяўленьне гэтай дырэктывы адбывалася слаба. Верасьнёўскі пленум ЦК КП(б)Б, падводзячы папярэднія вынікі чысткі і вярбоўкі рабочых у партыю, рэгуляваньня сацыяльнага складу КП(б)Б, канстатаваў, што:

«Даныя сьведчаць аб зьніжэньні росту партыі за кошт камсамолу... за паўгодзьдзе 1929 г.—35,9 проц., а за 1928 г. —41,1 проц.».

Толькі пасьля верасьнёўскага пленуму ў ЛКСМ выявіўся некаторы пералом у бок узмацненьня перадачы ў партыю з камсамолу большага процанту рабочай моладзі па сацыяльным становішчы (да 54,3 проц. за апошні квартал 1929 г. і да 68,2 проц. за першы квартал 1930 г.).

А ў астатнім хоць у абсалютных лічбах за першыя 3 месяцы 1930 году ёсьць павялічэньне перадачы ў партыю камсамольцаў на 245 чал. (апошні квартал 1929 году—600 чал., а першы квартал 1930 году—845 чал.), але ўвесь 1929 год ішло сыстэматычнае абсалютнае памяншэньне росту партыі за лік ЛКСМ і ўдзельная вага камсамольцаў сярод прынятых у партыю сыстэматычна з кварталу ў квартал увесь час зьніжаецца (з 37,5 проц. за першы квартал 1929 году да 21,5 проц. за першы квартал 1930 г.). З прычыны невыстарчальнага тэмпу перадачы лепшых камсамольцаў у партыю і неадпаведнасьці гэтага тэмпу тэмпам росту самога ЛКСМБ, недапушчальна скарачаецца парт. ядро ў ЛКСМ (з 23,4 проц. на 1-га студзеня 1929 г. да 15,4 проц. на 1-га красавіка 1930 г.). Таксама ідзе на зьніжэньне і камсамольская праслойка ў радох КП(б)Б. Недапушчальна зьніжаецца процант батракоў і с.-г. рабочых у ліку перадаваемых камсамольцаў у партыю (з 13,3 проц. за 3-ці квартал 1929 г., да 8,7 проц. за 4-ты квартал 1929 году і да 5,2 проц. за першы квартал 1930 году).

Такое становішча росту партыі за лік ЛКСМ сьведчаць аб зусім невыстарчальнай увазе да гэтай справы з боку партыйных і камсамольскіх арганізацый.

Партыйныя арганізацыі на мясцох павінны дапамагчы камсамолу найбольш хуткім тэмпам перабудаваць работу, асабліва ў галіне папаўненьня партыі за лік рабочай моладзі, каб забясьпечыць поўнае выкананьне пастановы студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б і пастановы бюро ЦК ад 16/V г. г. аб перабудове ўсёй работы ЛКСМ адпаведна новым тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва.

У справе прыёму жанчын за гэты пэрыяд КП(б)Б дабілася значнага пералому, асабліва па ўцягненьні ў партыю работніц ад варштату. **Усяго жанчын за 15 месяцаў прынята ў рады КП(б)Б 1.585 чал., сярод якіх 1.306 чал., або 82,4 проц. зьяўляюцца работніцамі** на вытворчасьці. У якасным прыёме жанчын ёсьць нават лепшае становішча, чым у агульным росьце КП(б)Б за лік рабочых, бо ўдзельная вага работніц з вытворчасьці ў агульным прыёме жанчын перавышае 80 проц. У 1928 годзе процант жанчын у агульным росьце складаў 12,8 проц., у той час, калі ў 1929 годзе складае 16,2 проц.

Аднак, трэба адзначыць, што за апошні час гэта работа пачынае аслабляцца, ня гледзячы на тое, што партыя ставіла сваёй мэтай, пры рэарганізацыі партапарату і ліквідацыі жанаддзелаў, найбольшае ўзмацненьне работы сярод працоўных жанчын, уцягваючы іх ва ўсе галіны работы па сацыялістычным будаўніцтве і дабіцца таго, каб гэта работа зьяўлялася абавязкам ня толькі жаночых аддзелаў, але ўсёй партыі, усёй прафарганізацыі і савецка-каапэрацыйнага апарату. На сёнешні дзень у радзе месц работа сярод жанчын ня толькі не ўзмацнілася ў адпаведнасьці з апошнімі дырэктывамі, а наадварот аслабла. Аб гэтым у першую чаргу сьведчыць аслабленьне ўцягненьня ў партыю перадавых работніц, батрачак і с.-г. работніц. Калі ў агульным прыёме за 1929 год жанчыны складалі 16,2 проц., дык за першы квартал 1930 году, ня гледзячы на абсалютны рост, ёсьць рэзкае зьніжэньне процанту жанчын у агульным прыёме да 13,7 проц. Разам з гэтым пры слабасьці работы па ўцягненьні ў партыю батрачак, с.-г. работніц і калгасьніц, мы маем яшчэ большае нагоршаньне, калі прыняць пад увагу яшчэ тое, што жаночая праслойка ў агульным складзе КП(б)Б павялічылася толькі на 0,8 проц. (з 11,8 проц. на 1/I 29 г. да 12,6 проц. на 1/IV 30 г.).

Рад акруговых і раённых камітэтаў паказалі зусім не абгаворвалі пытаньняў работы сярод жанчын і ўзмацненьня работы па ўцягненьні іх у партыю, між тым, як у гэтых арганізацыях назіраецца некаторае аслабленьне работы дэлегацкіх сходаў і культурна-масавай работы сярод працоўных сялянак. Зусім ясна, што такога становішча з ростам КП(б)Б за лік жанчын у далейшым быць не павінна. Партыя павінна будзе дабіцца і дабіецца рашучага пералому ў бок узмацненьня гэтай работы, прымаючы рашучыя меры ў адносінах тых кіраўнікоў, якія ігнаруюць работу сярод жанчын.

Падводзячы агульныя вынікі росту КП(б)Б за пэрыяд з XII-га да XIII-га зьезду неабходна падкрэсьліць, што КП(б)Б у цэлым праароблена ў гэтым кірунку вялікая работа ў духу пастановаў XVI партканфэрэнцыі УсеКП(б), XII зьезду КП(б)Б і пленумаў ЦК нашай партыі.

У выніку гэтай вялізарнай работы і неаслабнай увагі да яе з боку Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б зьмяніўся ўвесь склад КП(б)Б у бок павялічаньня ўдзельнае вагі перадавых рабочых у арганізацыі як па сацыяльным становішчы, так і па родзе занятканю.

Калі на 1-ае студзеня 1929 году рабочыя па сацыяльным становішчы складалі ў КП(б)Б 59,5 проц., дык на 1-ае красавіка 1930 году рабочыя складаюць 66,9 проц. Рабочыя, непасрэдна занятыя на вытворчасьці, замест 39,4 проц. на 1-ае студзеня 1929 году складаюць на 1-ае красавіка 1930 г. 46,1 проц. Павялічылася ўдзельная вага батракоў і сельска-гаспадарчых рабочых у КП(б)Б з 1,1 проц. на 1-ае студзеня 1929 году да 3,9 проц. на 1-ае красавіка 1930 году. Значна павялічылася ў сувязі з разгорнутым тэмпам калектывізацыі вёскі, удзельная вага сялян-калгасьнікаў: з 1 проц. на 1-е студзеня 1929 г. да 9,2 проц. на 1-ае красавіка 1930 году. Прычым гэта праходзіла пры сыстэматычным зьніжэньні процанту служачых у КП(б)Б з 35,6 проц. на 1-е студзеня 1929 г. да 32,4 проц. на 1-ае красавіка 1930 году.

За ўвесь гэты пэрыяд—15 месяцаў—КП(б)Б выраслa на 5.875 чал., увабраўшы ў сябе лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы Беларусі, здольных даць рашучы адпор разам з усёй партыяй усялякім адхіленьням ад ленінскай лініі партыі.

Да свайго XIII зьезду КП(б)Б прыходзіць з агульным лікам камуністых 39.256 чал., з якіх членаў партыі 70,5 проц. і 29,5 акндыдатаў.

«Гэта,—як піша «Правда»,—бясспрэчны паказальнік сувязі партыі з рабочай клясай. Гэта яшчэ адзін паказальнік таго, як рабочая кляса наперакор правым і «левым» апартуністым, ухваляе, безагаворачна ухваляе, палітыку партыі, якою кіруе ленінскі ЦК».

І ня гледзячы на тое, што ў гэты пэрыяд шмат рабочых-камуністых было высунута на работу ў савецкі, прафэсыянальны і каапэрацыйны апараты, а таксама мабілізавана на работу ў вёску, дзякуючы такому прыліву ў рады партыі рабочых, у КП(б)Б удзельная вага рабочых, непасрэдна занятых на вытворчасьці, ня толькі ня зьменшылася, але значна ўзрасла (з 39,4 проц. да 46,1 проц.). Гэта дае ўсе падставы і ўпэўненасьць у тым, што пастановы XII зьезду КП(б)Б і пленумаў ЦК аб давядзеньні да паловы ў складзе партыі рабочых з вытворчасьці да канца 1930 г. поўнасьцю будуць выкананы.

Але было-б не па-бальшавіцку, каб мы, гаворачы аб нашых посьпехах, забывалі пра нашы слабыя месцы, нашы паасобныя недахопы і не завастрылі-б увагі нашай партыі на перамаганьні гэтых недахопаў, на ўзьняцьці якасьці і ўзмацненьні тэмпаў працы па выхаваньні і ўцягненьні ў партыю перадавых пластоў рабочых, батракоў, с.-г. рабочых і беднякоў-калгасьнікаў.

Ленінскі прыліў у рады КП(б)Б, які даў 36,9 проц. усяго прыёму ў КП(б)Б за 15 месяцаў, паказаў, што рад партыйных арганізацый і вытворчых ячэек аказаліся невыстарчальна гібкімі і здольнымі поўнасьцю і своечасова скарыстаць палітычны ўздым сьвядомасьці рабочых мас, для ўзмацненьня далейшай сыстэматычнай работы па ўцягненьні ў рады партыі новых пластоў перадавых рабочых. Таму на радзе фабрык і заводаў наглядаецца паслабленьне гэтай працы (абутковая фабрыка ў Менску, Віцебская панчошная фабрыка і г. д.).

У радзе калектываў і арганізацый ня зжыты тэндэнцыі кампанейскай вярбоўкі рабочых у партыю.

Выбарачнае абсьледваньне (гл. артыкул т. Гаруновіча ў «Партработніку» № 1 за 1930 г.) работы вытворчых ячэек у галіне вярбоўкі рабочых у партыю, якое правёў ЦК па Менскай і Бабруйскай акругах, выявіла, што ёсьць нават і такія ячэйкі і камуністыя, якія лічаць пытаньне росту партыі «другараднай» справай і зусім пытаньнямі росту не займаліся.

Гаворачы аб якасьці прыёму, трэба яшчэ раз падкрэсьліць, што **рост КП(б)Б ішоў у масе сваёй за лік перадавых элемэнтаў рабочае клясы**, здольных ісьці ў авангардзе рабочых мас, якія асабістым прыкладам дапамагаюць росту вытворчасьці, паляпшэньню якасьці працы, разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Але побач з гэтым ёсьць рад фактаў, калі дырэктыва партыі аб якасным прыёме скажаецца. У партыю часамі трапляюць і прагульшчыкі, ілжэ - ўдарнікі, недысцыплінаваны і навытрыманы элемэнт. Для пацьвярджэньня гэтага досыць паказаць на такі факт: у частцы ячэек Менскай і Бабруйскай арганізацый было пэрсанальна апытана больш за 200 чал. прынятых у партыю. Выявілася, што сярод іх была поўная колькасьць прагульшчыкаў і такіх, якія ніякага ўдзелу ў вытворчай і грамадзкай рабоце ня прымалі.

Ёсьць таксама рад прыкладаў, калі ў партыю прымаюцца новыя рабочыя, толькі што прышоўшыя на вытворчасьць, якія пе прайшлі ніякай палітычнай загартаванасьці, не пераварыліся ў рабочым асяродзішчы ў той час, як сярод старых рабочых не вядзецца ніякай работы па ўцягненьні іх у рады партыі.

Ёсьць недахопы і ў галіне **палітычнай падрыхтоўкі новага партыйнага папаўненьня.** Так з ліку прынятых па Віцебскай акрузе з часу XII партзьезду да 1-га красавіка 1930 году прайшлі школу палітграматы толькі 520 чал., а па Бабруйскай акрузе за гэты час з ліку прынятых 1.174 чал. прайшлі школу палітграматы 464 чал.

Работа па палітычным выхаваньні новага партыйнага папаўненьня абстаіць дрэнна. **У выніку гэтага мы маем амаль поўны правал працы па палітычным выхаваньні новага партыйнага папаўненьня на Аршаншчыне. Зусім слаба пастаўлена гэта работа ў Бабруйскай і Полацкай акругах.**

У афармленьні новага прыёму яшчэ назіраецца недапушчальная цяганіна, справы прымаемых у партыю залежваюцца па два і тры месяцы. Так, па Гомельскай акрузе за апошні квартал 1930 году засталося неразгледжаных заяў 50,6 проц., па Магілёўшчыне — 28 проц., Аршаншчыне — 44 проц., Бабруйшчыне — 37,7 проц.

Завастраючы ўвагу на галоўнейшых недахопах у галіне росту партыі і рэгуляваньня сацыяльнага складу, трэба дабіцца рашучага пералому ў бок зьнішчэньня гэтых недахопаў, што гарантуе ў галоўнай ступені посьпехі далейшага росту партыі за лік перадавых пралетараў, батракоў і с.-г. рабочых, а таксама правяўшых сябе ў барацьбе за калектывізацыю сялян - калгасьнікаў; гарантуе найбольшае забясьпечэньне непахіснай баяздольнасьці партыі для далейшых перамог над клясавымі ворагамі, перамог на фронце сацыялістычнага перабудаваньня краіны.

А. ПІПКІН і Ал.ШМАТКОЎ.

25-гадовы юбілей народнага паэты Янкі Купалы

НАРОДНАМУ ПАЭЦЕ БССР тав. КУПАЛЕ Я.

ПАВАЖАНЫ ЯН ДАМІНІКАВІЧ!

Савет Народных Камісараў БССР шчыра вітае Вас з днём 25-гадовага юбілею Вашай літаратурнай дзейнасьці.

Савет Народных Камісараў з задаваленьнем адзначае Вашы заслугі перад працоўнымі масамі Беларусі, якіх Вы сваімі творамі ў часы панаваньня царызму заклікалі на барацьбу за ўстанаўленьне лепшага жыцьця, за папепшаньне долі працоўнага сялянства. Вашы творы зьявіліся вялікім укладам у скарбніцу беларускай культуры. Рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам сваёй Камуністычнай партыі, пры дапамозе пралетарыяту ўсяго Савецкага Саюзу, у цесным саюзе з бядняцка - серадняцкім сялянствам у дні вялікага Кастрычніка 1917 году, скінула векавых прыгнятацеляў-капіталістых і абшарнікаў і устанавіла дыктатуру пралетарыяту, вызваліла сялянства ад уціску абшарнікаў, павёўшы яго за сабой па шляху будаўніцтва новага, сацыялістычнага жыцьця.

Пралетарская Кастрычнікавая рэвалюцыя вызваліла Беларусь ад нацыянальнага прыгнечаньня, вывела на шлях сапраўднай вольнасьці. Савецкая Беларусь пасьля Кастрычнікавай пралетарскай рэвалюцыі стала роўнай сярод роўных — брацкіх савецкіх рэспублік, складае непарыўную частку вялікага Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Рабочыя і працоўныя сяляне БССР, выгналі беларускую буржуазію, будуюць новае, нябачанае ва ўсім сьвеце, сацыялістычнае жыцьцё. Гэтая вялікая сацыялістычная будоўля патрабуе многа культурных сіл, патрабуе разьвіцьця новай пралетарскай культуры, якой Вы і надалей можаце аказаць вялікія паслугі.

Савет Народных Камісараў выказвае глыбокую надзею, што Вы, Ян Дамінікавіч, і надалей будзеце ісьці ў ногу з рабочай клясай БССР па яе шляху, і сваімі далейшымі творамі, якія будуць вырастаць ужо на новай пралетарскай глебе, будзеце заклікаць шырокія масы працоўных на справу вялікай будоўлі сацыялізму.

Савет Народных Камісараў жадае, каб Вы яшчэ доўгія годы жылі і працавалі над далейшым разьвіцьцём беларускай культуры — пралетарскай па зьмесьце і нацыянальнай па форме.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Менск, 27 мая 1930 г.

Беларуская Акадэмія Навук вітае юбіляра

Беларуская Акадэмія Навук вітае народнага паэту Янку Купалу з 25-гадовым юбілеем яго творчасьці.

Вялікі Кастрычнік стварыў Савецкую Беларусь. Пад кіраўніцтвам нашай Камуністычнай партыі рабочая кляса і сцэмэнтаваныя ёю бядняцка - серадняцкія масы Савецкай Беларусі з вялікім уздымам ідуць па шляху сацыялістычнага будаўніцтва. У штодзённых баёх культурнай рэвалюцыі ўзрастае і ўзмацняецца наша пралетарская культура, нацыянальная па форме.

Беларуская Акадэмія Навук, пабудаваная воляй Савецкай улады, лічыць сваім абавязкам быць актыўнай удзельніцай у культурнай рэвалюцыі, у барацьбе за ўзмацненьне сацыялізму і пралетарскай культуры, як на Беларусі, так і ва ўсім СССР.

Акадэмія ўпэўнена, што акадэмік, народны паэта Янка Купала, яшчэ многа год будзе працаваць на шляхох сваёй творчасьці і разам з усёй рабочай клясай і працоўнымі масамі ўложыць не адну цагліну ў вялікі будынак сацыялізму і пралетарскае культуры.

Прэзыдэнт Акадэміі Навук
У. ІГНАТОЎСКІ.

Прывітаньне Галоўмастацтва

Галоўмастацтва БССР горача вітае Вас з днём 25-гадовай літаратурна - мастацкай дзейнасьці па ніве беларускай літаратуры.

Вялікі Кастрычнік вызваліў працоўныя масы БССР ад сацыяльнага і нацыянальнага ўціску, даўшы поўную магчымасьць раней прыгнечаным працоўным масам шырока разгарнуць свае творчыя сілы як у галіне гаспадарчага будаўніцтва, гэтак і ўзбагачэньня каштоўнасьцяй свае пралетарскае культуры, нацыянальнае па форме, выкарыстоўваючы з народнае творчасьці і культуры буржуазнай усё тое, што патрэбна ім у іх барацьбе і будаўніцтве. Усё гэта стварыла мажлівасьць Вам надалей служыць гэтым задачам у высокім званьні Народнага паэты.

Галоўмастацтва БССР са ўсёй шчырасьцю жадае Вам посьпехаў на шляху тварэньня паэзіі, якая ўзбуджала-б творчы энтузіязм працоўных мас у вялікай сацыялістычнай будоўлі і звала на ўпартую барацьбу прыгнечаныя яшчэ працоўныя масы Заходняй Беларусі.

Галоўмастацтва. І. ГУРСКІ, Яз. ДЫЛА.

Стыпэндыя імя Янкі Купалы

У адзнаку 25-цігадовага юбілею літаратурна - мастацкай дзейнасьці народнага паэты БССР ЯНКІ КУПАЛЫ Калегія НКАсьветы ўстанавіла дзьве стыпэндыі яго імя.

З іх адну — на літаратурным аддзяленьні Пэдфаку БДУ і другую — на Менскім Белпэдтэхнікуме.

У адзнаку 25-цігадовай літаратурнай дзейнасьці народнага паэты Беларусі Янкі Купалы праўленьне БДУ пастанавіла вызначыць за кошт БДУ стыпэндыю імя Янкі Купалы на літаратурным аддзяленьні пэдфаку Белдзяржуніверсытэту.

ЯНКУ КУПАЛЕ

Народны Камісарыят Асьветы БССР вітае Вас з 25-цігодзьдзем літаратурна-мастацкай дзейнасьці.

Ваша творчасьць па працягу 25 год дапамагала працоўнаму сялянству Беларусі ўсьведамляць неабходнасьць пазбавіцца ад бядоты і гора і шукаць шляхоў выйсьця да новай лепшай будучыні.

Гэтае выйсьце працоўнае сялянства знайшло ў Кастрычніку 1917 г., калі яно, на чале з рабочаю клясаю, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі прагнала абшарнікаў і прыступіла да пабудовы сацыялізму.

Вашы песьні вывучае новае малодое пакаленьне ў нашых савецкіх працоўных школах, таму рабочая і працоўная сялянская моладзь і наогул усе працоўныя масы патрабуюць, каб гэтыя песьні былі сугучны інтарэсам рабочае клясы, каб яны служылі будаўніцтву сацыялістычнае культуры.

Выказваючы ўпэўненасьць, што Ваша ліра яшчэ многа год будзе гучэць на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва, жадаем посьпехаў у далейшай Вашай творчасьці.

Народны камісар асьветы
ПЛАТУН.

Ад пралетпісьменьнікаў Зах. вобласьці

Вітаем Вас з 25-гадовым юбілеем літаратурнай і грамадзкай дзейнасьці. Выказваем упэўненасьць, што ваша творчасьць і надалей будзе адбіваць імкненьні бядняцка - серадняцкіх мас Савецкай Беларусі да сацыялістычнага будаўніцтва.

САКРАТАРЫЯТ АСАЦЫЯЦЫІ ПРАЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ
РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ

Прывітаньне БДВ

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва шчыра вітае юбіляра з дваццаціпяцігадовай творчай працай у беларускай літаратуры. Мы ўпэўнены ў тым, што яшчэ шмат гадоў будзе гучэць твой голас, дапамагаючы справе сацыялістычнага будаўніцтва і будаўніцтва беларускае пралетарскае культуры.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

Усім членам і кандыдатам КП(б)Б

У ЧЭРВЕНІ месяцы у газ. «ЗЬВЯЗДА» будуць друкавацца найбольш поўна усе матар'ялы XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б).

Каб атрымліваць «Зьвязду» своечасова

падпісвайцеся на ЧЭРВЕНЬ і далейшыя месяцы **зараз-жа**

Да XVI зьезду УсеКП(б)—давесьці прамфінплян да варштату

Кожны рабочы павінен ведаць сваё месца ў агульным вытворчым пляне прадпрыемства

Рашуча ўдарыць па бюракратызьме заводзкіх арганізацый, якія недаацэньваюць гэтага мерапрыемства

Чаму зьнізілася прадукцыйнасьць на заводзе „Камунар"

Налёт «лёгкай кавалерыі» на прадпрыемствы, які адбываецца зараз, выявіў, што амаль на ўсіх фабрыках і заводах Менску прамфінплян не даведзены да варштату і да кожнага рабочага. Пасьпяховая барацьба за выкананьне прамфінпляну і ліквідацыю прарываў першых сямі месяцаў гаспадарчага году немагчыма без ажыцьцяўленьня гэтага важнейшага мерапрыемства. Матар'ялы абсьледвацельскіх брыгад даюць яскравыя ўзоры недаацэнкі і неразуменьня многімі нашымі гаспадарнікамі неабходнасьці, каб кожны рабочы дакладна ведаў свае абавязкі, сваё заданьне, сваё месца ў агульным вытворчым пляне прадпрыемства. У гэтых адносінах вельмі цікавая справаздача аб заводзкай канфэрэнцыі ўдарнікаў заводу «Камунар». У выніку недавядзеньня прамфінпляну да варштату, на гэтым лепшым па выкананьні прамфінпляну заводзе, мы мелі ў красавіку рад буйных зрываў.

Усё гэта гаворыць аб неабходнасьці неадкладна разгарнуць шырокую кампанію па давядзеньні прамфінпляну да асобнага варштату і рабочага. Мы высоўваем лёзунг: «Да XVI зьезду УсеКП(б) — прамфінплян павінен быць даведзены да варштату на ўсіх прадпрыемствах БССР».

***

У першым паўгодзьдзі завод «Камунар» працаваў, можна сказаць, зусім добра. Прадукцыйнасьць заводу з кожным месяцам павялічвалася і дайшла ў сакавіку да 128 проц. вытворчай праграмы. Але ўжо ў сакавіку наглядаліся некаторыя сымптомы, якія сыгналізавалі аб паслабленьні ўвагі адміністрацыі і грамадзкіх арганізацый да работы заводу. На заводзе атрымалася тое, чаго і трэ' было баяцца. На заводзе **супакоіліся на посьпехах.** Вельмі характэрна, што на запытаньне супрацоўніка «Зьвязды» — чаму не даведзены прамфінплян да варштату, дырэктар заводу тав. Левін адказаў: «Мы і так прамфінплян выконваем». У гэтым адказе было выразна чуваць стара - расійская «шапкамі закідаем» і сьвядомае ігнараваньне неабходнасьцю змагацца з вытворчымі недахопамі.

У красавіку завод «Камунар» раптам даў зьніжэньне прадукцыйнасьці. Калі ў сакавіку вытворчая праграма была выканана на 128 проц., дык у красавіку — **толькі на 104 проц.** Пры чым, бляшаны цэх, які выканаў вытворчую праграму за паўгодзьдзе на 117 проц., выканаў праграму красавіка толькі на 83 проц., кавальска-мэханічны цэх—на 96,3 проц.

Такое становішча, зразумела, выклікала хваляваньне ўсяго рабочага калектыву. Пад уражаньнем гэтага хваляваньня і прайшла **другая вытворчая канфэрэнцыя**, скліканая для абгаварэньня вынікаў самаправеркі выкананьня прамфінпляну і сандагавору.

На працягу цэлага месяца часовая кантрольная камісія і 97 ударнікаў - добраахвотнікаў правяралі работу заводу, удзельнікаў сацспаборніцтва, ударнікаў і кіруючых арганізацый. У падагуленых выніках самаправерачных брыгады азначаюць, што асноўнымі прычынамі зьніжэньня прадукцыйнасьці ў красавіку зьяўляюцца: адсутнасьць унутрызаводзкага спаборніцтва, адсутнасьць кіраўніцтва ўдарнікамі, недавядзеньне прамфінпляну да варштату, ігнараваньне адміністрацыяй рабочых прапаноў і інш. Адсутнасьць кіраўніцтва ўдарнікамі прывяло да таго, што ў бляшаным і кавальскім цэхах пачалі наглядацца выпадкі прагулаў, парушэньняў працдысцыпліны, нядбайных адносін да варштатаў і матар'ялаў з боку некаторых рабочых і нават асобных ударнікаў. Уліку ўдарнікаў ня было. Таму ЧКК і самаправерачным брыгадам прышлося ў часе праверкі ўстанаўляць шляхам апытаньняў майстроў і паасобных рабочых сапраўдных ударнікаў і ілжэ - ўдарнікаў.

На вытворчай канфэрэнцыі сабраліся 180 дэлегатаў. Ва ўступным слове старшыня заўкому тав. Сьлёзбэрг заклікаў дэлегатаў да бальшавіцкай самакрытыкі, каб лягчэй было зьнішчыць недахопы. Дэлегаты адказалі актыўнымі выступленьнямі. Пасьля дакладу разгарнуліся гарачыя спрэчкі. Выступалі ня толькі дэлегаты, але і шмат рабочых і работніц, якія прысутнічалі на канфэрэнцыі.

— Чаму ў нас, у бляшаным цэху, здарыўся прарыў? — пытаецца тав. **Агінец.**

— Таму, што брак даходзіў да 70 процантаў — кінуў хтосьці з месца.

— Гэта адна з прычын, кажа т. Агінец. Было зроблена 60.000 дэталяй для ведзер і фляшак, а потым гэтыя-ж дэталі прышлося перарабляць, на што пайшло 10 лішніх дзён і страчана каля 700 руб.

— Нам патрэбны былі бляхі для бідонаў у 20 фун., а мы рэзалі бляхі для бідонаў у 12 фун. Прышлося ўсё зроблене выкінуць, як брак.

— Ніякай барацьбы са стратамі ў нас не вядуць. На дварэ валяцца адкіды, жалезны лом, часткі ад машын і ніхто на гэта не зварачае ўвагі, гаворыць тав. **Карначоў.**

— Адміністрацыя ня выконвае рабочых прапаноў, сярод якіх бываюць і вельмі каштоўныя.

— Можна было-б дабіцца ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня прамфінпляну, кажа кіраўнік вытворчай групай заводу тав. **Лаўрусэвіч.**

— Канфэрэнцыя павінна палажыць канец усяму таму, што перашкаджае нармальнай рабоце заводу і выкананьню прамфінпляну.

— Адміністрацыя павінна зьнішчыць недахопы, выяўленыя самаправеркай.

— Мы абяцаем надыходзячым зьездам партыі змагацца за выкананьне пяцігодкі за 4 гады. Мы патрабуем пастаяннага кіраўніцтва ўдарніцтвам з боку заводзкіх арганізацый.

Вось аб чым гаварылі дэлегаты канфэрэнцыі. І каб падмацаваць свае словы — справай, **электра - мантэры, у ліку 5-ці чалавек, абвясьцілі сябе на канфэрэнцыі ўдарнай брыгадай імя XVI партзьезду і абавязаліся ўшчыльніць рабочы дзень, эканоміць матар'ялы, сачыць, каб ня было прастояў па віне мантэраў. Тры рабочыя бляшанага цэху абвясьцілі сябе ўдарнай камунай імя XVI зьезду і абяцалі выканаць абавязацельствы, узятыя на сябе іншымі ўдарнікамі цэху.**

У сваёй рэзалюцыі канфэрэнцыя абяцае партыі рашуча змагацца са ўсімі недахопамі і не дапусьціць зрыву выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

На канфэрэнцыі таксама адбылося прэм'яваньне лепшых ударнікаў. Ліцейны цэх зазначае перавыкананьне прамфінпляну (перавыкананьне вытворчай праграмы на 20 проц., прадукцыйнасьці працы на 3 проц.) зьніжэньне сабекошту на 4 проц.) **атрымаў пераходны сьцяг.** Прымаючы пачэсны падарунак, ст



Птушнік у саўгасе Сеньніца Самахвалавіцкага раёну

Партыйныя дырэктывы аб кадрах на пэдфаку БДУ ня выконваюцца

ДАТЭРМІНОВЫ ВЫПУСК 3-ЦІХ КУРСАЎ ПАД ПАГРОЗАЮ ЗРЫВУ

Улічваючы вострую патрэбу ў новых кадрах для розных галін нашага будаўніцтва, ЦК партыі даў дырэктыву аб узмацненьні тэмпу падрыхтоўкі новых спэцыялістых. Вялікі недахват кваліфікаваных пэдагогаў востра адчуваецца і па лініі народнае асьветы.

У сувязі з гэтым запрапанавана Беларускаму Дзяржаўнаму Унівэрсытэту зрабіць датэрміновыя выпускі 3-х курсаў пэдфаку. Як-жа пэдфак спраўляецца з гэтай работай, як ён прыстасоўвае сваю работу да запатрабаваньняў сучаснага моманту.

Трэба адзначыць, што ў гэтых адносінах справа на пэдфаку пастаўлена зусім дрэнна. Пэдфак з работай па прысьпешаным выпуску 3-х курсаў не спраўляецца. Вось прыклад: абвешчан прысьпешаны выпуск літаратурна-лінгвістычнага аддзяленьня 3-га курсу пэдфаку. Гэтае аддзяленьне абвешчана ўдарным. Між тым, ніякага ўдарніцтва ў рабоце не адчуваецца, ня гледзячы на тое, што літ.-лінг. аддз. павінна скончыць сваю работу да 15 кастрычніка гэтага году. Сярод студэнтаў выкрыта шмат ілжэ-ўдарнікаў.

Выкладаньне многіх дысцыплін на гэтым аддзяленьні зрываецца. У другім сэмэстры ў расклад лекцый было пастаўлена выкладаньне гісторыі грамадзкае думкі. Ня гледзячы на сур'ёзнасьць гэтай дысцыпліны, выкладчык **ГЕСЭН** набудаваў свой курс так, што студэнты перасталі цікавіцца яго лекцыямі, бо большасьць цытаньняў па гэтай дысцыпліне яны распрацавалі, праходзячы курс гісторыі Расіі і расійскай літаратуры ў мінулым годзе.

Прышлося выкладчыку Гесэну не хадзіць на лекцыі, а перабудоўваць курс па гісторыі грамадзкае думкі. Заняткі зрываліся. За тры месяцы т. Гесэн быў на лекцыях ня больш з раз. За май мес. ён таксама не прачытаў ні аднэй лекцыі па сваёй дысцыпліне. Між тым, апошняя ў раскладзе значыцца. Наогул т. Гесэн да свае работы ва унівэрсытэце адносіцца нядбайна. Звычайна за 15 мінут да пачатку лекцыі ён вывешвае запісачку, што яго лекцыя не адбудзецца.

Зрываюцца заняткі і па новай расійскай літаратуры. Ужо тры разы вывешваўся расклад па гэтай дысцыпліне, але выкладчык т. Саўсун да работы яшчэ не прыступіў.

Горш за ўсё пастаўлена справа з выкладаньнем ленінізму. Тут дэканат пэдфаку выявіў вялікую нядбайнасьць. Дэкан **т. Усьпенскі** чамусьці сваячасова не паклапаціўся і не падшукаў выкладчыка па гэтай вельмі паважнай дысцыпліне. Ленінізм у раскладзе лекцый Ужо сарваны трэція заняткі.

Ня лепш пастаўлена работа і на іншых аддзяленьнях пэдфаку.

Дэканат пэдфаку не зразумеў усёй важнасьці дырэктыў партыі аб узмацненьні падрыхтоўкі новых кадраў спэцыялістых.

Стварэецца пагроза, што ўсе скончыўшыя пэдфак у прысьпешаным парадку выйдуць са сьцен БДУ марксыцка ня ўзброенымі, не падрыхтаванымі належным чынам да работы.

ТЭХА.

Улічыце практыку мэталістых

Перавыбары рабачкомаў будаўнікоў—

НЕ КАРЫСТАЮЦЦА НАЛЕЖНАЙ УВАГАЙ

Прадстаўнік ЦСПСБ на пабудову нават не зьяўляецца

На пабудове унівэрсытэцкага гарадка падрыхтоўка да перавыбараў рабочага камітэту пачалася ў першыя дні мая. Пачынаючы з 8 мая, у цэхах праводзіліся гутаркі з рабочымі аб важнасьці справаздачна-перавыбарчай кампаніі і ўдзелу ў яе шырокіх мас рабочых. Рабочыя правялі вялікую зацікаўленасьць і актыўнасьць да перавыбараў свайго органу. Пачаўся добраахвотны запіс у брыгады па самаправерцы работы рабачкому. У першыя-ж дні ў добраахвотныя брыгады запісалася каля 20 чалавек.

10 мая адбылося пашыранае пасяджэньне рабачкому разам з прафактывам па пытаньні аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі. На пасяджэньні прысутнічала каля 100 рабочых. Галоўным чынам, увага актыву была накіравана на пытаньне аб шырокім прыцягненьні рабочых пубудовы для ўдзелу ў самаправерцы работы і перавыбарах. Рабочыя арганізавалі сацыялістычнае спаборніцтва паміж групамі-арцелямі на лепшую актыўную дапамогу рабачкому ў правядзеньні кампаніі. Першымі ўступілі ў спаборніцтва ўдарныя групы цесьляроў і чорнарабочых.

Зараз сацыялістычным спаборніцтвам ахоплена каля 450 рабочых. Дагавор, заключаны паміж групамі рабочых, мае 3 пункты. У першым пункце рабочыя абавязваюцца прыняць актыўны ўдзел у самаправерцы работы рабачкому; у другім пункце гаворыцца аб уважлівым абмеркаваньні кандыдатур лепшых вытворцаў-ударнікаў у новы склад рабачкому; у трэцім пункце рабочыя ўзялі на сябе абавязак усямерна дапамагчы рабачкому ў правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі і дабіцца ўдзелу ў ёй усіх 100 проц. рабочых.

17 мая адбыўся агульны сход рабочых, на якім было шырока абмеркавана пытаньне аб перавыбарах. На гэтым сходзе ў добраахвотныя брыгады на самаправерцы запісалася яшчэ 50 рабочых. Такім чынам, зараз праверку работы рабачкому праводзяць 70 чалавек. Гэтыя добраахвотнікі разьбіты на 10 брыгад. Кожная брыгада правярае асобную галіну работы рабачкому. Так, брыгада № 1 правярае, як кіраваў рабачком сацыялістычным спаборніцтвам на пабудове, брыгада № 2 правярае выкананьне праграмы будаўніцтва, брыгада № 3—мерапрыемствы рабачкому па правядзеньні адзінапачальня, брыгада № 4—выкананьне адміністрацыяй рабочых прапаноў, брыгада № 5—удзел у калектывізацыі сельскай гаспадаркі і г. д.

Трэба сказаць, што **ЦП саюзу будаўнікоў слаба кіруе падрыхтоўкай да справаздачна - перавыбарчай кампаніі на пабудове.** Усю работу праводзіць рабачком пабудовы. Але, паколькі амаль усе члены рабачкому разьехаліся або заняты іншай грамадзкай работай, фактычна ўсю работу па падрыхтоўцы да справаздачна - перавыбарчай кампаніі прыходзіцца праводзіць **старшыні рабачкому.** Зразумела, што адзін чалавек ня можа справіцца з такой вялізарнай і важнай работай.

Прадстаўнік ЦСПСБ, вылучаны для дапамогі рабачкому, чамусьці дагэтуль **не знайшоў патрэбным зьявіцца на пабудову.**

Гэты недахоп трэба зьнішчыць. Тэрміну для падрыхтоўкі засталося мала. На 1 чэрвеня намечан першы справаздачны сход рабочых. ЦП саюзу будаўнікоў і ЦСПСБ павінны ўзмацніць увагу да перавыбараў рабачкому на будаўніцтве унівэрсытэцкага гарадка.

С. Г.

Зьвярнеце ўвагу

(ДА МАСТАЦКАГА АФАРМЛЕНЬНЯ ВЫСТАЎКІ)

Беларускім мастацкім тэхнікумам, са згоды Галоўмастацтва быў зроблен датэрміновы выпуск 4-га курсу з тым, каб накіраваць студэнтаў для працы на Усебеларускай выстаўцы с.-г. і прамысловасьці. Праз 2 тыдні пасьля выпуску ад Галоўвыстаўкому было атрымана запатрабаваньне на 20 чал. і аванс у 1.000 рублёў. Арганізаваныя ў калектыў студэнты-выпускнікі 17 мая паехалі на працу з мэтай паказаць калектыўны мэтад працы, арганізаванасьць і супроцьпаставіць гэта рвацкім настроям асобных мастакоў, што працуюць па выстаўцы.

Што-ж атрымалася па прыезьдзе ў Менск.

А вось што.

Праца на выстаўцы па мастацкім афармленьні павільёнаў і аддзелаў зусім не арганізавана. Многія мастакі нахапалі на горла працы і, не спадзяючыся закончыць яе да тэрміну, шукаюць «тэхнічных сіл», набралі ўсялякіх людзей, у тым ліку і сацыяльна-чужых элемэнтаў, выключаных у свой час з тэхнікуму. Як відаць, арганізатары мастацкай працы на выстаўцы забыліся аб існаваньні на Беларусі дзяржаўнага мастэхнікуму, калі дапусьцілі такое становішча. Тав. **Ахрэмчык,** кіраўнік мастацкага афармленьня выстаўкі, нават заявіў, што і гэты калектыў у 20 чал. быў «нахальна навязаны» дырэктарам тэхнікуму.

Прыехаўшы калектыў ўжо тыдзень чакае працы. Не таму, што працы няма. Працы шмат. Працы ў некаторых аддзелах пагражае зрыў, бо ўзяўшыя яе мастакі з ёю ня ў сілах да тэрміну справіцца. Уся рэч у сыстэме арганізацыі працы. **Калектыў студэнтаў прасіў даць ім афармленьне павільёнаў і аддзелаў (пад кіраўніцтвам старэйшых мастакоў).** Яшчэ неафармленыя павільёны ёсьць. Але Пасрэдмастацтва пры пасылцы на працу трымаецца мэтаду зьнішчэньня, распыленьня калектыву. Яно мяркуе пасылаць прыехаўшых таварышоў паасобку да мастакоў, якія ўжо ўзялі працу, каб заткнуць «дзіркі» ў недахваце ў іх «тэхнічнай сілы».

ЦП саюзу працмастацтва мякка абыходзіць гэтае пытаньне. Яно гаворыць добрыя словы аб калектыве, аб тым, што яго падтрымаць трэба, але... нічога канкрэтнага ня робіць.

Калектыў студэнтаў-выпускнікоў жадае працаваць, як калектыў, каб даць добрую працу, арганізаваную і сваячасовую. Мы патрабуем тэрміновай дапамогі з боку грамадзкіх арганізацый.

РСІ павінна заняцца праверкай ходу працы па мастацкім афармленьні выстаўкі, каб папярэдзіць прарывы.

Па даручэньні калектыву студэнтаў-выпускнікоў **ФРУМІН.**

Угробілі 62.000 фляндсаў трускавак

Менскі акрсадсаюз прыслаў на ст. Віттенштэйнская для Смалявіцкага райпаляводсаюзу 62.000 фляндсаў трускавак для засеву па калгасах раёну. Прысланыя трускаўкі марынаваліся на станцыі больш тыдню, і райпаляводсаюз не паклапаціўся іх выкупіць і разьмеркаваць па калгасах раёну. І толькі пасьля таго, як начальнікам станцыі былі абвешчаны таргі, гэтыя трускаўкі выкупілі.

Здавалася-б усё. Прысланыя трускаўкі неабходна было-б тэрмінова раздаць па калгасах для пасадкі. Але раённыя спэцы, жадаючы пазбавіцца ад лішняй работы, знайшлі даволі арыгінальны выхад са становішча. На прысланыя трускаўкі быў на месцы складзен акт, паводле якога з 62.000 фляндсаў былі прызнаны годнымі для засеву толькі 20.000. Акт падпісалі аграном раёну **Мураўёў** і садавод **Рабіновіч.** На гэтым і супакоіліся. Кошыкі з фляндсамі трускавак былі адвезены ў двор саўгасу Смалявічы і там кінуты бяз усякага нагляду і без перадачы іх хаця-б азначанаму саўгасу.

Улічыўшы такое становішча з кінутымі ў дварэ трускаўкамі, работнікі саўгасу з ліку 62.000 фляндсаў засадзілі лепшымі 1 гэктар, што ў сярэднім павінна раўняцца 35.000 штук. Ужо адзін гэты факт гаворыць, што акт быў складзен няправільна. Мала таго, мы са спэцыялістым саўгасу тав. **Шчарбовічам** праверылі на месцы зьмест акту і выявілася, што прысланыя фляндсы трускавак годны для пасеву, а вызначаны актам процант годнасьці не адпавядае сапраўднасьці. Фляндсы трускавак у кошыках зьверху падсохлі, але карэньні і самая расьліна іх ня страцілі эфэкту, і пры жаданьні прысланыя трускаўкі можна было-б скарыстаць на 85-90 проц.

Так і было зроблена: «безгаспадарчыя» трускаўкі, якія знаходзіліся ў дварэ саўгасу, у кошыках прамачылі ў вадзе, і **кіраўнік саўгасу з садоўнікам** парашылі гэтыя трускаўкі пасадзіць. Але, з прычыны адсутнасьці свабодных плошчаў, усе трускаўкі ня могуць быць скарыстаны.

Злачынны факт з трускаўкамі ня першы, ёсьць і іншыя падобныя факты накшталт таго, што на складзе райпаляводсаюзу ў Смалявічах да гэтага часу ляжыць 5 пудоў часнаку, які падлягае раздачы калгасам для пасеву. І гэта ў той час, як калгасы адчуваюць вялікую патрэбу ў часнаку для пасеву.

Трэба сяго-таго добра ўзгрэць за такія адносіны да работы і за разбазарваньне дзяржаўных сродкаў.

Ор.

Магутнасьць Сталінбуду павялічваецца да 92.000 кілёват

На падставе матар'ялаў пяцігадовага пляну прамысловасьці і камунальнага будаўніцтва выявілася, што ва ўсходняй частцы Беларусі магутнасьць Сталінбуду ні ў якім разе ня зможа задаволіць патрэбнасьцяй прамысловасьці ў электраэнэргіі. У сувязі з гэтым ВСНГБ быў прынят рад мер да фарсаваньня будаўніцтва другой чаргі Сталінбуду.

Цэнтральны электра-тэхнічны савет у Маскве ўжо зацьвердзіў праект работ другой чаргі, які прадугледжвае ўстаноўкі на Асінбудзе яшчэ двух турбін савецкай вытворчасьці па 12.000 кілёват кожная. Работы пачнуцца ўжо ў гэтым годзе. Два катлы і адна турбіна ўжо заказаны ленінградзкаму мэталюргічнаму заводу. Работы другой чаргі павінны быць скончаны ў 1931-32 годзе.

Апрача таго распрацоўваецца пытаньне аб 3-яй чарзе Асінбуду. Намячаецца ўстаноўка двух турбагенэратараў па 24.000 кілёват кожны.

Такім чынам, агульная магутнасьць Асінбуду па сканчэньні работ трэцяй чаргі дасягае 92.000 кілёват.

Прыём у вышэйшую калгасную школу

Паводле пастановы ЦК УсеКП(б), курсы калгасных работнікаў рэарганізаваны ў вышэйшую калгасную школу, якая будзе знаходзіцца пад загадам Калгасцэнтру СССР.

У задачы школы ўваходзіць — падрыхтоўка кіраўнікоў буйных калгасных аб'яднаньняў і інструктароў калгаснай сыстэмы.

Для БССР у гэтай школе вызначана 10 месц. Пры прыёме ў школу будзе зьвернута асаблівая ўвага на сацыяльнае становішча паступаючых. У ліку прынятых павінна быць ня менш 60% рабочых і батракоў і 15% жанчын. Натрабуецца, каб паступаючыя мелі ўзрост ня вышэй 38 год.

Усе камандараваныя т.т. павінны мець агульную асьвету ня ніжэй за чатырохгадовую школу. Прынятыя на курсы забясьпечваюцца стыпэндыяй ад 150 да 225 руб. у месяц, у залежнасьці ад сацыяльнага становішча.

Уся праца па вызначэньні і адборы кандыдатур у вышэйшую калгасную школу павінна быць скончана не пазьней 5-га чэрвеня.

Весткі аб камандыраваных трэба падаць у Белкалгасцэнтр. Для канчатковага адбору кандыдатаў у Менску створана цэнтральная камісія з прадстаўнікоў ЦК КП(б)Б, Калгасцэнтру і НКЗ. Пры зацьвярджэньні кандыдатаў будзе аддаваецца перавага таварышом, якія маюць добры вопыт у працы на калгасным будаўніцтве.

Адначасова з гэтым друкуюцца правілы прыёму ў вышэйшую калгасную школу.

Праверка работы дваццаціпяцітысячнікаў

Белкалгасцэнтр паслаў у акругі трох інструктароў для праверкі ўмоў работы 25-цітысячнікаў. Да гэтай праверкі прыцягваюцца прафсыянальныя, шэфскія арганізацыі і галоўным чынам, прадпрыемствы, якія камандыравалі рабочых ў калгасы.

Праверачная работа ў некаторых акругах — Гомельскай, Мазырскай — ужо разгарнулася. У Гомелі вылучана 11 рабочых, якія выехалі ў раёны для непасрэднага азнаямленьня з ўмовамі работ 25-цітысячнікаў.

Першыя весткі з месц сьведчаць аб тым, што некаторыя партыйныя, савецкія і прафэсыянальныя арганізацыі не аказваюць рабочым, пасланых у калгасы, належнай дапамогі і падтрыманьня. Каапэрацыя не прыняла мер да забесьпячэньня прадуктамі рабочых, якія працуюць у калгасах. У Гомельскай акрузе 25-цітысячнікаў прыраўналі ў адносінах да забесьпячэньня прадуктамі не да рабочых, а да служачых.

250 РАХУНКАВОДАЎ Ў КАЛГАСЫ

Ва ўсіх акругах БССР адкрыліся курсы па падрыхтоўцы рахункаводаў для калгасаў. Курсы ўкамплектаваны камсамольцамі-калгаснікамі. Тэрмін навучаньня — тры месяцы.

Усяго курсы выпусьцяць 250 чалавек. На курсы асыгнавана каля 50 т. р.

16 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ НА ГАНДЛЁВА-КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Сёлета на гандлёва-капітальнае будаўніцтва ў БССР асыгнавана 16 мільёнаў руб. супроць 6-ці мільёнаў руб. мінулага году. У плян работ уключана пабудова яйка-птушкавага камбінату ў Жлобіне, сельска-гаспадарчага камбінату ў Воршы, мясного камбінату ў Віцебску, пяцёх грамадзкіх сталовых, двух хлебазаводаў ў Барысаве і Полацку, рад малочных фэрм і г. д.

ЗА ДЗЕНЬ

— Учора а 11 гадз. раніцы на пляцы Волі быў даны старт удзельнікам зорнага вэляпрабегу па Менскай акрузе, прысьвечанаму XII зьезду КП(б)Б. У прабазе прымае ўдзел 9 вэлёсыпэдыстых фізкультурнікаў.

— НКАЗ разьмеркаваў па акругах БССР 108 новых дактароў, якія зараз скончылі мэдфак БКУ. Каля 25 дактароў пакінуты ў Менску для стажаваньня пры Ахрматмладзе.

З лістоў рабселькораў

ПАЧАЎСЯ ПРЫЛІЎ У КАЛГАС

Калгас «Савецкая Беларусь» (Сьмілавіцкі раён) на агульным сходзе прыняў чатырохразрадную сетку аплаты працы. Дагэтуль ужывалася падзённічына, вынікам чаго мелі месца розныя непаразуменьні. Калгасьнікі таксама зацьвердзілі парадак разьмеркаваньня капіталу згодна новага статуту сельска-гаспадарчай арцелі. Сяляне, якія раней выйшлі з калгасу, зноў падаюць заявы аб прыняцьці іх у лік членаў калгасу.

М. ПІСКУН.

З ВЫПЛАТАЙ ГРОШАЙ ДРЭННА

На лесараспрацоўках Пастапоўскага вучастку Лесбелу (Мазыршчына), дзе занята шмат сялян, дрэнна пастаўлена справа з разьлікам. Сяляне вымушаны за 15-20 кілёмэтраў па пекалькі раз хадзіць па грошы. Калі прыдзе адзін селянін, дык касір кажа: «Прывядзеце яшчэ чалавек 10, тады буду выдаваць грошы». Сам касір у гэты час разгульвае па канцылярыі. Трэба зьнішчыць гэты бюракратызм.

ЛАГУН С.

ЧАКАЮЦЬ ЗАМАЦАВАЛЬНЫХ ТАЛЁНАЎ

Да гэтага часу ў Верхменьскім сельсавеце (Смалявіцкі раён) не атрыманы замацавальныя талёны трэцяй пазыкі індустрыялізацыі. Насельніцтва гэтым учынкам абурана і чакае, калі будуць выданы замацаваныя талёны.

П. Ф.

ЗРЫВАЮЦЦА ВАЖНЕЙШЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ

Дагавары па кантрактацыі махоркі, кармавых буракоў і тэхнічных культур яшчэ Мазырскім паляводсаюзам не дасланы мясцом. Кантрактацыя збожжавых культур на мясцох не правярэцца і няма даных аб закантрактаваных плошчах. Справа з ваннаваньнем правальваецца.

Падрыхтоўку да Ўсебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўкі па акрузе акрпаляводсаюз даручыў дзеляводу.

Хто зьверне ўвагу?

КАЛГАСЬНІК.

СІЛАСАВАНЬНЕМ НЕ ЗАЙМАЮЦЦА

У Аршаншчыне нічога ня чуваць пра сіласаваньне. Акруговыя ўстановы ў гэтым кірунку нічога ня робяць. Няма ніякіх плянаў.

Тэрмін сяўбы расьлін на сілас канчаецца, а акруговыя працаўнікі маўчаць.

К.

НЯМА КІРАЎНІЦТВА

Ніякай работы з селькорамі ў Расьнянскім раёне не вядзецца. Пры большасьці сельсаветаў не выдаюцца насьценгазэты. Раённая рэдкалегія наогул ніякай работы не праводзіць. Парт'ячэйкі не дапамагаюць і слаба кіруюць работай рэдкалегій.

З.

АДМІНІСТРАЦЫЯ ЗРЫВАЕ ПАДРЫХТОЎКУ КАДРАЎ

У Магілеве арганізаваліся курсы на падрыхтоўцы рабочых у ВТНУ і ВНУ. Курсы пачалі сваю работу ў лістападзе мес. мінулага году. На курсах займаецца большая частка партыйнаў і камсамольцаў, якія да гэтага часу не разгружаны ад партыйных і грамадзкіх нагрузак. Адміністрацыя не вызваляе курсантаў ад работы раней на 2 гадзіны, а таксама ад вячэрніх і начных зьмен.

Акрана, зьвярні ўвагу.

Партноў.

Забыліся аб селькораўскім руху

Заслаўскі райком партыі не дааценьвае селькораўскай работы. На працягу дзесяці месяцаў у Заслаўскім раёне ня было ні аднаго рабселькораўскага сходу.

Паглядзем, як выказваюцца некаторыя партыйныя працаўнікі аб селькораўскіх заметках. Сакратар райкому партыі **Майсеяў** кажа: «Няхай пішуць»... «Няхай рэдактары чытаюць»... «Пішы, пішы, ганарар атрымаеш»...

Член партыі **Куніцкі** на адкрытым партыйным сходзе сьмяецца з рабкораў. Бязумоўна, такія словы з боку партыйцаў ня могуць рабіць добрага ўплыву на рабселькораўскую работу. Такім адносінам трэба даваць рашучы адпор.

Ня менш важным зьяўляецца сваячасовае рэагаваньне і расьсьледваньне селькораўскіх заметак. У Заслаўскім раёне некаторыя заметкі ляжаць па сем-восем месяцаў.

За дзесяць месяцаў пры Заслаўскім нардоме выпушчаны толькі чатыры кампанійскія нумары насьценгазэты.

Раённай партарганізацыі трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на селькораўскі рух, зразумеўшы, што гэта ёсьць частка агульнапартыйнай работы. У бліжэйшым часе трэба склікаць агульны сход селькораў, згуртаваўшы іх навакол партыі. Райком партыі павінен карэнным чынам зьмяніць адносіны да рабселькораўскага руху.

А-к.



Яслі ў Камуне «Зьвязда» Пухавіцкага раёну

Менская акр. культпрап. нарада

29-га мая ў 10 гадз. склікаецца Менская акруговая культпрапнарада з наступным парадкам дня:

1. Задача прапаганды марксызму-ленінізму ў зьвязку з чарговымі задачамі партыі (т. **Камянштэйн**).
2. Вынікі партасьветы ў акрузе за 1929-30 нав. год (т. **Гарэлік**).
3. Аб пастаноўцы масавай партасьветы ў горадзе і ў вёсцы на 1930 г. (т. **Орліс**), судаклад АК ЛКСМБ (т. **Палей**).
4. Аб тэарэтычнай вучобе актыву (т. **Модэль**).

На нараду выклікаюцца заг. АПА і Культпропу РК, раённыя прапагандыстыя, заг. АПА РК ЛКСМБ у горадзе і ў раёне.

Да ўвагі мабілізаваных ЦК КП(б)Б у лік „60-ці"

Культпроп ЦК КП(б)Б у другі раз прапануе зьявіцца (пакой № 16 да т. Рогавай) наступным т. т.:

Лудкевіч (Белпайгандаль); Сапожнікаў (ЦК мэталістых); Сакольскі (Сакр. яч. ЦВК); Вончак (ЦВК); Бандарэнка (Акадэмія Навук); Айзенсон (Наркамфін); Мазур (Наркамасьветы); Якубчык (БДУ); Кісялеў (Мустэхнікум); Вадзінчук (Скурсындыкат); Баран (Дзяржплян); Іваўчэнка (Наркамфін); Бояр (Дзяржгандаль).

Ухіленьне таварышоў, якія мабілізаваны згодна пастановы Сакратарыяту ЦК, ад яўкі, будзе разглядацца як грушэньне партыйнай дысцыпліны.

Акрамя таго, наступныя таварышы атрымалі камандыроўкі, але да гэтага часу не зьявіліся ў рэдакцыі газэт, з якіх яны прымацаваны:

1. Захарава (Наркампрацы); 2. [illegible] бург (Белкаапсаюз); 3. Смарчкоў (ВС[illegible]

Пытаньне аб гэтых таварышох [illegible] даецца ў АКК.

Ад Кастрычніцкага РК КП(б)Б

Пастаяннымі кіраўнікамі гурткоў для прапрацоўкі пастаноў XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) па Кастрычніцкім раёне вызначаюцца наступныя т.т.:

Ашаровіч, Палякоў, Плаўнік, Румянаў, Ляўкоў—да яч. заводу «Бальшавік», Кугель, Мінц, Сякерская, Вайняровіч — «Энэргія», Майсевіч, Матусэвіч, Любіч і Левіна — «Чырвоная Зорка», Эрэнбург, Аронава — Сьпіртазавод, Міхайлаў, Пыжыкаў, Лібман і Аварын — вагон. майст., Юргенсон, Рэмізэвіч, Вішнеўская і Агранаўскі — мал. рамонт вагонаў, Шаліма, Буклей, Гайдукевіч і Крэсік — сл. пуці, Задоеў, Каранеўскі, Путнін і Смых—сл. эксплёат., Лісейчык і Кавецкі — ФЗУ, Жыгмунт, Сьмірноў і Гутман — Дэпо, Флсер і Бягун—5 узвод аховы, Раготнер і Эфрон—ТПО, Царонак і Каструлёў — Менхладбойня, Арабей і Круцялеў — абутковая майстэрня, Кейлін і Стракоўскі — грузчыкі, Зейфман і Едзідовіч УМТ, Пракоф'ева, Белкіна і Клыс — хэмфармзавод, Новікаў, Лінг і Рудзіцкі — шклозавод, Фрыдман, Мікуліч і Нікольскі — каўбасная фабрыка, Розэнгауз, Палякоўскі, Гершман, Чарны і Рыўлін — абутковая ф-ка, Мар'ясіна, Гінзбург—лямцавая ф-ка, Залатарова, Багарад, Големшток і Заўкі — шчотачная ф-ка, Яршова, Бакін і Рэзьнікава — шчаінная ф-ка, Мяровіч — Утылізацыя, Рыўкін, Жылынскі і Зысман — «Адраджэньне», Лубуш і Казючыц—ф-ка імя Крупскай, Сьвярдловіч — аб'яднаная прафшкола, Сініцын і Дубравіцкі — «Чырвоны мік», Пэўзнэр — скурсындыкат, Яўмалочны завод, Бацьвінік і Дубіна — Белсампрасаюз, Эфрон, Пікман і Бакін — Белсампрамсаюз, Лейц і Ласкі — ЦІП, Цэнцыпэр, Усьмінская, Кац — Чырвоны Крыж, Хаскін, Лацкі — ЦРД, Касавер і Хэўлін — Палата мер і вагі, Яфімаў, Альпяровіч, Кац, Гурэвіч, Зелічонак і Падольскі — МЦРК, Эльнаў, Коціх і Гайдук — БСІКА, Самахвалаў і Губскі — спраўдом, Губская — Дом Гр. Дз.

Усе гэтыя т.т. павінны прысутнічаць на нарадзе раённага партактыву, які адбудзецца 29-га мая ў 18 гадз. у клюбе імя Леніна ст. Менск пас., дзе будуць стаяць пытаньне — вынікі партасьветы за 1929-30 г. і плян партасьветы на летні час. Аб часе і месцы заняткаў кіраўнікі павінны дагаварыцца з ячэйкамі не пазьней 1-га чэрвеня.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

29-га мая ў 18 гадз. **у клюбе Імя Леніна** ст. Менск пас. адбудзецца Кастрычніцкі раённы сход партактыву з парадкам дня:

1. Аб чарговых задачах райпартарганізацыі і ўдзеле ў рабоце райпартактыву.
2. Аб перавыбарах фабзаўмясцкомаў і задачах партактыву ў перавыбарах.
3. Вынікі партасьветы за 1929-30 г. і плян партасьветы на летні перыяд.
4. Бягучыя справы.

На гэты сход павінны ў абавязковым парадку зьявіцца сакратары і чыны бюро парткалектываў, ячэек і цэх'ячэек, кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў — партыйцы, чл. фр. ЦП саюзаў мэталістых, гарбароў, хэмікаў і чыны начнікаў і фр. фабзаўмясцкомаў і рэдактары насьценгазэт — партыйцы.

У зьвязку з палітбоем канфэрэнцыя чытачоў «Комсомольской Правды» пераносіцца з 24-га на 30-га мая на 7 гадз. увеч. у клюб саўгандальслужачых.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Справаздача рэдакцыі «К. П.» (дакл. прадстаўніка рэдакцыі).
2. Узнагароджаньне чырвоным сьцягам імя «Комсомольской Правды» лепшай ячэйкі.

Пасьля канфэрэнцыі мастацкая частка. Дасланыя білеты на канфэрэнцыю па ячэйках павінны быць разьмеркаваны сярод чытачоў «Ком. Правды», частка білетаў сярод нечытачоў.

Камсамольцы на канфэрэнцыю праходзяць па сваіх чл. біл. Упоўнаважаныя яч. па «Ком. Правде» пры ячэйцы павінны прадставіць на канфэрэнцыю зводку руху тыражу за май і чэрвень м-цы.

СЁНЬНЯ

Кастрычніцкі РК МОПР'у скл. аг. сход вытворч, яч. МОПР'у. Яўка прадст. і сакр. яч. МОПР'у абавязк. Запраш. актыў. Пач. у 19 г.

ЖАКТ № 4 (Савецкая, 97). Нарада камуністых жыхароў ЖАКТ'у № 4 у 19 гадз.

ЗАЎТРА

Дом Камасьветы. У 19 гадз. — груп. консульт. т. **Лур'е** для дакладчыкаў, вылучаных Фрунз. і Кастрычн. РК і распрацоўцы тэзісаў т. **Якаўлева** (пав. 19).

Ад Фрунз. РК КП(б)Б. У 18 гадз. (на мяшк. Мен. АК КП(б)Б, 3-ці паверх) — нарада чл. бюро яч. і цэх'яч. КП(б)Б чл. фр. ЦП саюзаў, фр. ФЗМК — па пытаньні перавыбарчай кампаніі ФЗМК і аб партвучобе ў летні час.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Серада, 28 мая для саюзу БУДАЎНІКОЎ
Білеты ў рабкасе і ў касе тэатру.
Спэктаклі мастацкага ансамблю „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ"
„РЫЧИ, КИТАЙ"
Пачатак а 8 з пал. гадз. увечары.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Мастацкі фільм у 7 частках
СЭКТАНТЫ
Звыш праграмы кіно-часопісь Саўкіно № 25.
Пачатак роўна а 7 г.)—(Каса ад 5 гадз

КІНО Цэнтральная
Амэрыканскі мастацкі фільм
1.000 КОНСКІХ СІЛ
(Бура ў Каліфорніі)
—) Звыш праграмы: КУЛЬТУРФІЛЬМ (—
Вытворчасьць электрычн. лямпачак
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч. | Каса а д 5 г

—)КІНО(— САД (Савецкая. 71)
ПАТ і ПАТАШОН у новай намэдыі
ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ кам. у 7 частках
Звыш праграмы хроніка САЎКІНО № 24
Пачатак 1-га сэансу а 9 гадз.)—(Каса з 6 г

КІНО Піяцтарны
ТРУКАВЫ КІНО-РАМАН
МІС МЭНД
2 сэрыі—11 частак у гадзін сэанс
У галоўнай ролі Ігар Ільінскі
Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. — Каса з 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
КУЛЬТУРФІЛЬМ
ТУРКСІБ у 5-ці частк.
Звыш праграмы хроніка „САЎКІНО"
Пачатак 1 сэансу а 2 гадз. дня. Каса з 12 г

КІНО Спартак
НЯМЕЦКІ БАЯВІК
Жыцьцё за Жыцьцё
драма ў 10 частках.
Пачатак 1 с.—6 г., 2 с.—8 г. 30 м., 3 с.—11 г.
Каса—з 5 гадз.

ДОМ АСЬВЕТЫ
5 чэрвеня, тэатрам „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ"
у памяшканьні летняга тэатру саду „ПРАФІНТЭРН"
для членаў саюзу працасьветы будзе пастаўлена п'еса
„ЧЕЛОВЕК с ПОРТФЕЛЕМ".
Білеты ў Доме Асьветы з 12—2 і з 6—10 гадз. увеч.

МЕНСКІЯ КУРСЫ РАДЫЁ-ТЭХНІКАЎ
даводзяць да ведама жадаючых паступіць на гэтыя курсы, што прыём заяў працягнут да 2 чэрвеня г. г.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на курсы па падрыхтоўцы ў Мар'іна-Горкі Садова-Гародны тэхнікум
ПРАЦЯГНУТ ДА 5 чэрвеня г. г.
На курсы прымаюцца рабочыя, батракі, беднякі, калгаснікі, якія маюць падрыхтоўку за пяць клясаў сямігодкі.
Заявы і дакументы (пасьведчаньне аб асьвеце; мэтрыка і даведка аб сацстановішчы) накіроўваць па адрасе: ст. Пухавічы, Зах. чыг., Мар'іна-Горкаму, Садова-Гародняму тэхнікуму.

АБВЕСТКА
З 20 мая ўсе ўстановы Дзяржаўнага Банку, ашчадныя касы і іншыя крэдытныя ўстановы
ВЫДАЮЦЬ ПАЗЫЧКІ
пад заклад аблігацый бяспроцантнай пазыкі 1929 г. і 9 проц. выйгрышнай пазыкі 1930 г.
Пазычкі выдаюцца ў разьмерах 60 проц. намінальнага кошту аблігацыі і па жаданьні трымальнікаў пазык афармляюцца прадзяўнічымі квіткамі. Продаж і купля паказаных пазык праводзіцца ўсімі крэдытнымі ўстановамі СССР бесьперашкодна і без абмежаваньня сумы.
Усебел. кантора Дзяржбанку

Менскі Дзяржаўны Музычны Тэхнікум
абвяшчае прыём заяў на 1930-31 навучальны год
на усіх аддзелах:
1) інструктарска-пэдагагічнага, 2) вакальнага, 3) струнных інструмэнтаў, 4) духавых інструмэнтаў, 5) фартап'яннага.
На 1-шы курс тэхнікуму прымаюцца з ведамі ў аб'ёме праграмы музычнае школы па спэцыяльным прадмеце, тэорыі музыкі, пачатковага сальфэджыо, абавязковым раялі і паліграмаце.
На падрыхтоўчыя курсы тэхнікуму прымаюцца выключна рабочыя, калгаснікі,